

ТРЭБА ТРЫМАЦЦА ЗА СВАЕ КАРАНІ **7**

РАЗМАЎЛЯЕМ ПРА «КОВІД» З УРАЧОМ-ІНФЕКЦЫЯНІСТАМ **13**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 ЛІПЕНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 144 (29258)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«Сітуацыя з цэнамі ў нас абсалютна спакойная. Мы знаходзімся ў прагнозных параметрах, нават ідзём ніжэй за прагноз. Задача, якая была пастаўлена перад урадам і Нацыянальным банкам, — гадавы рост спажывецкіх цэн не павінен перавышаць 5 %. З пачатку года мы маем індэкс росту спажывецкіх цэн 103,2 %. Прычым па кантраляваных цэнах ён яшчэ ніжэйшы. Вядома, быў складаны перыяд, калі з-за разрыву ланцужкоў пастаўшчыкоў пачалі ўзнікаць інфляцыйныя навесы, сталі падымацца цэны. Вы памятаеце, ажыятажны попыт узнікаў на імбір, лімоны, грэчку. Таму давялося тэрмінова гасіць гэтую сітуацыю і рэгуляцыйнымі, і эканамічнымі метадамі».*

## КОРАТКА

- **«Беларуснафта-Сібір» папоўніла парк абсталявання буравым комплексам новага пакалення.**
- Восем новых беларускіх мікрапраектаў атрымаюць гранты па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва.
- **«Белпошта» бясплатна даставіць паштоўку да Міжнароднага дня дружбы.**
- Першы блок БелАЭС плануецца цалкам увесці ў прамысловую эксплуатацыю ў І квартале 2021 года.
- **«Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў у Расію да 7 жніўня.**


ISSN 1990 - 763X


З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Хлеб патрэбны будзе заўсёды»

## Сёлета надвор'е спрыяе аграрыям, але тое, які будзе ўраджай, вырашаюць нават не дні — гадзіны

**Пра гэта, а таксама пра надзённыя задачы і перспектывы беларускага АПК ішла размова ўчора падчас наведвання Прэзідэнтам Нясвіжскага раёна.**

Пшанічныя палеткі ААТ «Новае жыццё» даюць ураджайнасць у сярэднім 97 цэнтнераў з гектара. Уборку ў раёне плануюць скончыць за два тыдні. Усё гэта добра, але кіраўніка дзяржавы цікавіць, якім сёлета будзе рэспубліканскі каравай.

***«9,5 мільёна тон збожжа — гэта мінімум, які мы павінны ўзяць.*** І мы можам яго ўзяць. Але пры гэтым трэба мець на ўвазе, што надвор'е будзе як раней: будуць дажджы і будуць пагодлівыя дні. Трэба будзе прыстасавацца. І гэта нармальна, бо акрамя збожжа ў нас жа ў полі і агародніння культуры, другі ўкос траў, будзе і трэці сёлета. Для гэтага патрэбна вільгаць, таму трэба радавацца, што такое надвор'е», — звярнуў увагу Прэзідэнт. Ён адзначыў, што зараз аграрыі мусяць лавіць кожную пагодную гадзіну.

У краіне, якая месціцца ў зоне рызыкоўнага земляробства, уборку трэба весці актыўна.

«Ад леташняга ўзроўню па тэмпах адстаём, таму трэба старацца, каб хоць выйсці на той узровень, які быў у мінулым годзе. Тэхнікі — мора, арганізаваць трэба. Не забывайце людзям заплаціць, бо ўборка, сяўба — гэта асноўныя кампаніі, дзе людзі могуць зарабіць добрыя грошы. Не шкадуйце людзям заплаціць за працу», — даручыў кіраўнік дзяржавы.



Фота БелТА.

Усе намаганні, упэўнены Прэзідэнт, у гэтыя дні павінны быць засяроджаны на полі.

**СТАР. 2**

# Каравай для камбайнера



Фота БелТА.

Гэтых кранальных дзяўчатак, якія сядзяць у коле камбайна, Леанід Шчаглоў сфатаграфаваў на палетках сельгаспрадпрыемства імя Крамко, што ў Гродзенскім раёне. Нагода прыбраным у нацыянальныя строі з'явіцца на збожжавым полі ў іх была важная — віншаванні камбайнераў, якія ўжо намалацілі тры тысячы тон ці наблізіліся да гэтага выніку. На палетках гэтай гаспадаркі працуюць пятнаццаць экіпажаў, і ўсе яны паказваюць высокія вынікі.

Пяшчотныя і моцныя



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# БЕРАГІНІ, ПРЫГАЖУНІ, МАЦІ, ТВОРЦЫ...

## Беларускі саюз жанчын дванаццаты раз узнагародзіў найлепшых жанчын года

**Любіць, лётаць, кахаць, ствараць, імкнуцца ўвышыню — усё гэта можа васільковая жар-птушка — сімвал і пачэсная ўзнагарода рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года», які вызначыў 38 найлепшых беларусак з больш чым 250 прэтэндэнтак.**

### СЛОВАМІ І ДЗЕЯННЯМІ

Адметнасцю сёлетняй цырымоніі стала ўганараванне і словы падзякі ды павагі не толькі пераможцам намінацый, але і медыкам, якія на сваіх плячах вынеслі пандэмію. **Старшыня БСЖ Мар'яна ШЧОТКІНА** паабяцала, што дапамога медыкам і медустановам, а таксама сем'ям спецыялістаў аховы здароўя ў межах акцыі «Марафон падтрымкі», распачатай Саюзам жанчын у красавіку, працягнецца і надалей.

**СТАР. 12**

# «Хлеб патрэбны будзе заўсёды»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

***«Выбары выбарамі, а есці ўсе хочуць. Хто б ні быў прэзідэнтам і губернатарам, хлеб патрэбны будзе заўсёды.*** Крый божа паўтарыць 90-я гады, калі (я ўжо расказваў) у Мінску было на тры дні мукі. ***Таму, чаго б нам ні каштавала, гэты хлеб трэба ўзяць іаднавіць рэзервы*** — асабліва ў Мінскай вобласці», — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка.

Пакупнікі на добры ўраджай знойдуцца: гэта не толькі хлеб для людзей, але і фураж для скаціны — а значыць, мяса і малако.

Як паведамілі Аляксандру Лукашэнку, сёлета ўборачная плошча каласавых збожжавых у краіне складае 2195,6 тысячы гектараў. На ўчарашнюю раніцу ўбрана 19 працэнтаў. Ураджайнасць дазваляе спадзявацца на атрыманне 8,1 мільёна тон агульнага ўраджаю (плюс 1,5 мільёна тон да ўзроўню мінулага года). Рапс убраны на 89 працэнтах плошчаў. У кампаніі задзейнічана 8,5 тысячы камбайнаў. Беларускі лідар пацікавіўся выніковасцю камбайнаў айчыннай вытворчасці — па словах аграрыяў, машыны добрыя.

Кіраўнік дзяржавы таксама пазнаёміўся з вытворчасцю Нясвіжскага завода дзіцячага харчавання, дзе рэалізуецца інвестыцыйны праект «Будаўніцтва сучаснага экспартаарыентаванага малакаперапрацоўчага прадпрыемства ўстаноўленай магутнасцю 500 тон прыёму малака ў суткі ў Нясвіжы».

Як расказаў Прэзідэнту старшыня савета дырэктараў Аляксандр Каранік, у Нясвіжы фактычна рэалізаваны новы тэхналагічны ўклад перапрацоўкі малака. Каля 96 працэнтаў прадукцыі экспартуецца — не толькі ў Расію, але таксама ў Кітай і краіны Еўрасаюза. Тона малака дае больш чым тысячу долараў, часам да 1300. Усяго за першае паўгоддзе завод атрымаў дзевяць мільёнаў прыбытку. Сярэдні заробак складае 1600 рублёў — па словах старшыні савета дырэктараў, жыхары Нясвіжа, якія раней з'ехалі на заробкі, вярнуліся на малую радзіму.

Скончылася наведванне прадпрыемства дэгустацыяй малочнай і кісламалочнай прадукцыі, на якую Аляксандр Лукашэнка традыцыйна запрасіў журналістаў. Жаночая палова асабліва ацаніла адсутнасць у нясвіжскіх прадуктах цукру — яны сапраўды і смачныя, і карысныя.

**Варвара МАРОЗАВА,**
**Нясвіжскі раён.**

З нагоды

## У Дзень горада Брэст ушануе вызваліцеляў

**Гэтым разам праз пандэмію ў Брэсце вырашылі не праводзіць традыцыйных вялікіх мерапрыемстваў.**

У дзень 76-й гадавіны вызвалення абласнога цэнтра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 28 ліпеня будуць ускладзены кветкі да помніка «Вызваленне» і да Вечнага агню ў крэпасці. На розных пляцоўках горада адбудуцца святочныя канцэрты. Невялікія канцэртныя праграмы запланаваныя і на наступныя выхадныя.

У сваім тэлеграм-канале **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК** яшчэ раз нагадаў жыхарам, чаму адмовіліся ад шырокіх масавых мерапрыемстваў: сёлета не будзе фестывалю «Горад Святла», міжнароднага парада аркестраў, карнавалу, фэсту «Аблокі малака», начнога канцэрта на плошчы Леніна і многіх іншых. «Галоўная прычына — клопат пра здароўе гараджан, — напісаў мэр. — Абяцаю, што наступны Дзень горада, у 2021-м, правядзём разам на найвышэйшым узроўні!»

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Жніво-2020

# СВЯТА «ТЫСЯЧНІКАЎ»

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ ушанаваў экіпажы камбайнаў, якія намалацілі тысячу тон збожжа новага ўраджаю, а таксама кіроўцаў-тысячнікаў на адвозцы збожжа. Падарункі і ганаровыя лісты, як знак падзякі за прафесіяналізм і вернасць абранай справе хлебароба, з рук кіраўніка вобласці атрымалі перадавікі жніва Добрушскага і Брагінскага раёнаў.**




Зараз на Гомельшчыне збожжавыя ўбраны больш чым на 30 % плошчаў. Агульны намалот складае каля 300 тысяч тон. Пры гэтым у шасці раёнах вобласці 20 экіпажаў камбайнаў сталі «тысячнікамі» і 45 кіроўцаў перавезлі па тысячы тон збожжа новага ўраджаю.

У ААТ «Калінінскі» — сельгаспрадпрыемстве Добрушскага раёна — сёлета разлічваюць намалаціць каля 10 тысяч тон збожжа. Гэта на чатыры тысячы перавышае леташнюю лічбу намалоту. Надзеі на добры ўраджай тым больш рэальныя, што надвор'е спрые, і падрыхтоўчая работа да ўборачнай была праведзена вельмі значная.

У «Калінінскім» ужо ўбрана амаль 60 % плошчаў, намалот — каля 6 тысяч тон. Тры экіпажы камбайнаў намалацілі тысячу тон збожжа новага ўраджаю, і чатыры кіроўцы сталі «тысячнікамі».

Кіраўнік рэгіёна ўручыў перадавікам уборачнай падарункавыя сертыфікаты і падзячныя лісты ад Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта.

— Работа ў сельскай гаспадарцы патрабуе пастаяннага напружання, вялікай самааддачы, гаспадарчага стаўлення да зямлі і тэхнікі. Мы дзякуем вам за прафесіяналізм і вернасць абранай справе хлебароба, — звярнуўся да герояў жніва Добрушскага краю Генадзь Салавей.

Старшы камбайнер-тысячнік ААТ «Калінінскі» Пётр Самойленка працуе ў сельскай гаспадарцы з 1989 года.

— У гэтае жніво ў нас ураджайнасць вышэйшая, чым была летась. У сярэднім выходзіць 40 цэнтнераў на круг, — падзяліўся лідар жніва.

У Брагінскім раёне «тысячнікі» — чатыры экіпажы камбайнаў і 13 кіроўцаў. Мясцовыя гаспадаркі ўвогуле сёлета спрацавалі як ніколі, а арганізацыя ўборачных работ заслугоўвае самых высокіх ацэнак. Усе гаспадаркі Брагіншчыны перасягнулі «экватар» жніва. Сярод лідараў у раёне — ААТ «Чамярыскі».

Словы ўдзячнасці прагучалі на адрас сямейнага тандэму Міхаіла і Віталя Салдаценкаў. На рахунку старшага камбайнера Міхаіла Салдаценкі ўжо пяць перамог на рэспубліканскіх спаборніцтвах па ўборцы збожжавых. Столькі ж разоў лідарам станавіўся і кіроўца на адвозцы збожжа Рыгор Малочка.

Сярод тысячнікаў ААТ «Чамярыскі» ёсць і жанчына — Марыя Фалей. Дырэктар сельскага дома культуры ў гэтую гарачую пару чацвёрты год працуе ў якасці памочніка камбайнера.

— Калі выходзіш на камбайне ў поле збіраць хлеб, разумееш, наколькі важная гэтая праца, — падзялілася жанчына.

Пасля цырымоніі ўшанавання герояў жніва Генадзь Салавей звярнуў увагу на тое, што сёлета ў Гомельскай вобласці ёсць усе шанцы атрымаць нядрэнны ўраджай збожжавых. Цяпер важна хутка, якасна і без страт завяршыць уборачную і распачаць наступны этап палявых работ.

— З такімі тэмпамі, як цяпер, мы ставім задачу ўбраць ураджай за два тыдні. Затым павінны прыступіць да зачыну на ўраджай будучага года — падрыхтавацца да азімай сяўбы. Мы павінны выканаць усе тэхналагічныя параметры, патрабаванні. Дзяржава дае нам падтрымку, стварае ўсе ўмовы, каб паспяхова справіцца з пастаўленай задачай. І патэнцыял для гэтага ў нас ёсць, — падкрэсліваe кіраўнік вобласці.

Задача сёлетняй азімай сяўбы, дадае Генадзь Салавей, — максімальна выкарыстаць элітнае насенне і зрабіць акцэнт на сортаабнаўленне:

— Летась мы закупілі пэўную колькасць «эліты» — гэта дало магчымасць паднячь нашы вытворчыя паказчыкі і атрымаць вышэйшыя ўраджаі. Таму акцэнт, безумоўна, будзем рабіць на сортаабнаўленні. Такую задачу ставім не толькі перад кожным раёнам вобласці, але і перад кожнай гаспадаркай рэгіёна.

* * *

### ДЗЯКУЙ ЗА РАБОТУ!

**Між тым у ААТ «Сцяг Радзімы», што ў Гомельскім раёне, з'явіліся першыя героі жніва-2020 — тры кіроўцы-тысячнікі на адвозцы збожжа новага ўраджаю.**

ААТ «Сцяг Радзімы» — перадавое сельгаспрадпрыемства не толькі Гомельскага раёна, але і вобласці. Механізатары гаспадаркі намалацілі ўжо амаль чатыры тысячы тон збожжа. Добраму выніку паспрыяла і тое, што адразу тры кіроўцы перасягнулі тысячны рубеж на адвозцы збожжа ад камбайнаў.

Кіроўцы-лідары ААТ «Сцяг Радзімы» — Аляксандр Турчанок, Ігар Лаўрыновіч і Аляксандр Агароднікаў. Каб ушанаваць перадавікоў непасрэдна ў полі, да іх прыехалі першы намеснік старшыні аблвыканкама Ігар Часнок і старшыня Гомельскага райвыканкама Алена Алексіна.

Віншуючы першых тысячнікаў сельгаспрадпрыемства Гомельскага раёна, Ігар ЧАСНОК адзначыў:

— Мы да вас прыехалі, каб сказаць шчыры дзякуй за работу! Гэта не паказное мерапрыемства, як, можа быць, хтосьці думае, а даніна павагі людзям працы. У нас дзяржава для людзей, і вы самая вялікая наша каштоўнасць, тыя самыя людзі, ад якіх шмат у чым залежыць харчовая бяспека краіны.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

У тэму

## Жніво на поўначы

**У Віцебскай вобласці сёлета ўборачная плошча збожжавых і зернебабовых большая, чым летась, прыблізна на 9 %. Усе раёны прыступілі да жніва.**

Сёлета плануецца задзейнічаць 1380 камбайнаў, у тым ліку тысячу — абсталяваных прыстаўкамі для ўборкі рапсу.

Пры добрых умовах надвор'я магчыма завяршыць жніво збожжавых за дваццаць дзён. Але ў кожным раёне трэба выкарыстоўваць асобны падыход, упэўнены **першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег МАЦКЕВІЧ.**

Для ўдзелу ў зборы ўраджаю плануюць задзейнічаць каля 5,7 тысячы чалавек, у тым ліку больш за 1,6 тысячы камбайнераў і старшых камбайнераў.

Пад ураджай наступнага года плануецца ў аптымальныя агратэхнічныя тэрміны правесці сяўбу азімых збожжавых культур на плошчы 300 тысяч гектараў, канстатуе **старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама Сяргей ЯГОРАЎ.**

Днямі пытанні жніва абмяркоўваліся ў Віцебску падчас пасяджэння аблвыканкама. **Губернатар Мікалай ШАРСНЁЎ** чакае ад кіраўнікоў усіх узроўняў — ад райвыканкама да гаспадаркі — каб яны кантралявалі падчас уборкі выкананне ўсіх тэхналагічных патрабаванняў. Поспех — у жорсткай дысцыпліне і адказнасці на палях. А **памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль ЛІНЕВІЧ** нагадаў пра асабістую адказнасць усіх, ад каго залежыць своечасовае і якаснае жніво, і запэўніў, што тым, каму трэба, будзе аказана дапамога.

Самае галоўнае — каб было разуменне, што колас не можа чакаць. А надвор'е, як сведчаць вопытныя аграрыі, сёлета вельмі спрые атрыманню рэкордных ураджаяў па ўсёй краіне, і Віцебшчына — не выключэнне.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Блізкая ўлада

# ШТО ХВАЛЮЕ ЖЫХАРОЎ ПОЎНАЧЫ КРАІНЫ?

**На прамую лінію губернатару Прыдзвінскага краю Мікалаю ШАРСНЁВУ патэлефанавала каля трыццаці чалавек.**


Фота Алега Клімовіча.

Асаблівая ўвага была ўдзелена зваротам ад жыхароў Аршанскага раёна, дзе, як вядома, па ініцыятыве Прэзідэнта вядзецца «перазагрузка». Безумоўна, там зроблена многае, і мясцовая ўлада разумее ўсю ступень адказнасці. Але... Жыхарка невялічкага гарадка Барань агучыла праблемы населенага пункта, у якім жыве каля 11 тысяч чалавек. Жанчына, маці малога дзіцяці, хацела б, каб было больш вулічных забаў: арэляў, каруселяў, дзіцячых горак і падобных рэчаў. Ды і лаўкі, аказваецца, у дэфіцыце! Заяўніца дадала, што неабходна яшчэ многае зрабіць у добраўпарадкаванні гарадка. Старшыня Віцебскага аблвыканкама даручыў кіраўніцтву Аршанскага райвыканкама не проста выехаць на месца, а напісаць план таго, што будзе зроблена ў Барані ў бліжэйшай перспектыве. Гэта важна яшчэ і для таго, каб у Год малой Радзімы людзі адчулі клопат і рэальныя змены. Мікалай Шарснёў паабяцаў неўзабаве асабіста прыехаць туды.

Жыхарцы Віцебскага раёна, якая паскардзілася на патоп у кватэры, губернатар паабяцаў юрыдычную дапамогу з боку аблвыканкама. Жанчына зможа, доўга не зацягваючы, падаць заяву ў суд. Яна жыве ў пасёлку Ноўка. Паводле яе слоў, кватэру залівала з-за капітальнага рамонту даху, які выконвалі камунальнікі.

Іншы заяўнік, жыхар абласнога цэнтра, не скардзіўся. Проста прасіў парады, як лепш распачаць справу ў галіне жывёлагадоўлі. Безумоўна, улада на ўсіх узроўнях мясцовага самакіравання зацікаўлена ў падтрымцы дзелавой ініцыятывы. Таму ахвотнаму стаць фермерам акажуць кансультацыйную і іншую дапамогу.

Іншыя заяўнікі з Віцебска паведамілі аб праблемах, звязаных з паркоўкай і інтэнсіўным рухам аўтамабіляў каля жылля, добраўпарадкаваннем прылеглых тэрыторый. Старшыні гарвыканкама даручана ўдзяліць асаблівую ўвагу так званаму прыватнаму будаўнічаму сектару ў горадзе — там дзесяцігоддзямі накопліваліся праблемы з пакрыццём вуліц. Губернатар прапанаваў прааналізаваць тэму і рацыянальна падыходзіць да пытання рамонту дарог не толькі там, дзе стаяць шматпавярховікі, але і ў раёнах прыватнай забудовы.

Вельмі парадавала губернатара размова з жыхаркай аграгарадка Вялікі Поўсвіж Лепельскага раёна. Жанчына падзякавала кіраўнікам мясцовай улады за тое, што яны ўважліва вывучаюць звароты, заўсёды вельмі ветлівыя падчас гутаркі. Імкнуцца зрабіць усё магчымае, каб рэальна дапамагчы без лішняй бюракратыі. Гэта, упэўнены губернатар, як лакмусавая паперка ў рабоце з людзьмі. Калі чалавеку можна аказаць падтрымку ў вырашэнні яго праблем, неабходна зрабіць усё магчымае, патрабаваў губернатар падчас падвядзення вынікаў прамой лініі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# МЕТАЛ — СПРАВА ТОНКАЯ

Завод белай бляхі ў Мёрах плануе экспартаваць у краіны Еўрасаюза прадукцыі на 190 мільёнаў еўра

**З выхадам на праектную магутнасць аб'ём вырабу інавацыйнай прадукцыі на заводзе металічнага ліста і белай бляхі ў Мёрах Віцебскай вобласці складзе больш за 220 мільёнаў еўра.**

Разлічана, што пры гэтым у краіны Еўрасаюза будзе экспартавацца прадукцыі амаль на 200 мільёнаў еўра. Пра гэта паведаміў падчас сустрэчы з працоўным калектывам і кіраўніцтвам металапракатнага завода **старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях краіны Аляксандр ШУМІЛІН.**

Паводле яго слоў, тэхнічныя магутнасці завода дазваляюць павялічыць аб'ём вытворчасці да 320 мільёнаў еўра ў год, адпаведна нарасціць і аб'ёмы экспарту.

«Па тэхналагічных магчымасцях завод па вытворчасці металічнага ліста і белай бляхі ў Мёрах не мае канкурэнтаў не толькі ў СНД, але і ў бліжэйшых заходніх краінах. Гэта сапраўды ўнікальная вытворчасць, якая дазволіць арганізаваць выпуск розных відаў інавацыйнай прадукцыі ў залежнасці ад патрэб рынку», — падкрэсліў Аляксандр Шумілін.

Як растлумачылі ў прэс-службе Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, праект па будаўніцтве завода ў Мёрах рэалізуецца ў рамках Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады і ў адпаведнасці з указам кіраўніка дзяржавы № 271 «Аб рэалізацыі інвестыцыйнага праекта». Яго інавацыйнасць заключаецца ў стварэнні вытворчасці прынцыпова новай для Беларусі, краін СНД і блізкага замежжа прадукцыі — белай бляхі таўшчынёй 0,1—0,5 міліметра. Пастаўшчыком абсталявання выступіла вядучая сусветная кампанія SMS Group GmbH (Германія).

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

# Яшчэ адзін халаднаваты тыдзень

**Ліпень сёлета не пацвярджае сваё званне «макаўкі лета». Вось і апошні тыдзень адыходзячага месяца выдасца больш падобны па надвор'і на жнівень. Будуць перыядычна ісці дажджы, а ў другой палове тыдня яшчэ і пахаладае. Падрабязней пра надвор'е расказалі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Самы цёплы дзень на гэтым тыдні будзе сёння. Паветра прагрэецца да 24-30 градусаў вышэй за нуль. Камфорту дадасць паўднёва-заходні вецер. Але агульную карціну азмрочаць кароткачасовыя дажджы, якія пройдуць на большай частцы тэрыторыі Беларусі. Дзе-нідзе прагрымяць і навальніцы. Пры іх чакаецца ўзмацненне ветру.

А вось у сераду да нас з Заходняй Еўропы змесціцца актыўны атмасферны фронт. Уначы па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях пачнуцца кароткачасовыя дажджы, якія на працягу дня распаўсюдзяцца на значную частку тэрыторыі краіны. Не абыдзецца і без навальніц. Удзень атмасферны фронт набярэ моц, і таму не выключаны моцныя ліўні і нават град. Захавецца паўднёва-заходні вецер, але паступова яго напрамак зменіцца на заходні. Вецер узмоцніцца да ўмеранага. Ноч чакаецца цёплая — ад 14 да 20 градусаў цяпла. А вось удзень разбежка тэмператур будзе прыкметнай — калі на паўднёвым усходзе сонца паспее распаліць паветра да 31 градуса цяпла, то на паўночным захадзе тэрмометры пакажуць не больш за 21 вышэй за нуль.

На гэтым летняе надвор'е зноў возьме тайм-аўт. У чацвер будзе ўсяго 18-24 цяпла. А ўначы — зусім не ліпеньскія 10-16. У нізінах могуць утварацца туманы.

Праўда, днём паўднёвыя раёны Брэсцкай і Гомельскай абласцей могуць разлічваць на некалькі дадатковых градусаў. Але ў якасці процівагі выступіць халодны заходні парывісты вецер. Месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы.

У пятніцу пахаладае яшчэ на пару градусаў, а непрацяглыя ападкі распаўсюдзяцца на большую частку тэрыторыі Беларусі. Да нас змесціцца франтальны падзел з паўночнага захаду Еўропы. Так што не хавайце далёка курткі і парасоны.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Будзь у трэндзе

# ЁСЦЬ ІДЭЯ? ПРАПАНУЙ

**Маладзёжны парламент пры Нацыянальным сходзе Беларусі запусціў платформу «Рух НАПЕРАД». Праект аб'ядноўвае моладзь, якая жадае прагрэсіўнага руху для краіны. Пра гэта расказаў старшыня Маладзёжнага парламента Ягор МАКАРЭВІЧ.**

— На жаль, мы сёння бачым, што ёсць рознага кшталту спробы заклікаць хлопцаў і дзяўчат да нейкіх дэструктыўных дзеянняў, у тым ліку праз Telegram-каналы. Безумоўна, мы павінны гэтаму супрацьстаяць. Мы хочам сфарміраваць правільны погляд на будучыню нашай краіны. Ведаем, што ў нас вялікая колькасць маладых людзей, якія хочуць, каб яна станавілася больш паспяховай. Таму наша платформа аб'ядноўвае прадстаўнікоў думаючай моладзі з розных сфер са сваімі поглядамі і меркаваннямі. Кожны ахвотны можа прадставіць сваю ідэю ці праект па тэму развіцця Беларусі, дазволіць сфарміраваць яе вобраз у доўгатэрміновай перспектыве.

У сацыяльных сетках запушчаны хэштэг #ДвижениеВперед, пад якім любы карыстальнік сацсетак зможа размясціць інфармацыю пра тое, што ён лічыць важным дасягненнем Беларусі за перыяд незалежнасці, або проста выказаць сваю думку па тэме. Да таго ж ужо працуе сайт vpered.online. Платформа прадугледжвае магчымасць пакінуць сваю заяўку для ўключэння ў маладзёжную каманду. «Там ёсць раздзелы, якія адлюстроўваюць блізкія для нас каштоўнасці: «Краіна, якой ганарымся», «Людзі, якім верым» і «Справы, якія важныя». Кожны малады чалавек зможа накіраваць на гэты сайт свае ідэі па паляпшэнні горада, вёскі або ўвогуле краіны. А мы, у сваю чаргу, абавязкова іх разгледзім, акумулюем і праз пэўны час накіруем у органы дзяржаўнай улады», — дадаў Ягор Макарэвіч.

Удзельнікі руху і члены Маладзёжнага парламента ў хуткім часе правядуць сустрэчы з маладзёжным актывам усіх абласцей і Мінска, па выніках якіх будуць адабраны ключавыя праекты, што стануць асноўнымі ў далейшай рабоце парламента.

Нагадаем, Маладзёжны парламент пры Нацыянальным сходзе Беларусі пачаў работу з ліпеня. Туды ўваходзяць 70 чалавек ва ўзросце ад 18 гадоў да 31 года, якія прадстаўляюць усе вобласці і Мінск.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Упершыню хваляванні ў ЗША назвалі не пратэстамі і беспарадкамі, а бунтам



Пасля масавых беспарадкаў у Сіэтле ў мінулыя выхадныя былі затрыманыя 47 чалавек. Як удакладняецца на сайце паліцыі горада, гэтыя людзі нападалі на праваахоўнікаў, адмаўляліся разысціся і перашкаджалі дзеянням паліцыі.

Падчас беспарадкаў пацярпелі 59 паліцэйскіх. У іх апёкі, удары і іншыя траўмы. Пратэстуючыя кідалі ў паліцэйскіх камяні, піратэхніку, бутэлькі. Траўмы па ступені цяжкасці вар'іруюцца ад ран і сінякоў да апёкаў і разрыву меніска. Адзін з праваахоўнікаў шпіталізаваны.

Дэпартамент паліцыі Сіэтла выпусціў заяву, у якой паведаміў, што беспарадкі ў горадзе дасягнулі такіх маштабаў і жорсткасці, што іх варта кваліфікаваць як бунт. Тое ж самае паведамілі аб пратэстах у сваім горадзе ўлады Портленда. Паводле амерыканскага заканадаўства, калі хваляванні кваліфікуюцца як бунт або мяцеж, гэта дае падставу прэзідэнту выкарыстоўваць войскі.

## Вялікабрытанія ўвяла двухтыднёвы каранцін для тых, хто адпачываў у Іспаніі



Брытанскія ўлады адрэагавалі на рост інфіцыравання каранавірусам у Іспаніі, з нядзелі зноў абавязаўшы самаізалявацца на 14 дзён тых, хто вяртаецца з адпачынку ў гэтай краіне, а таксама з Канарскіх і Балеарскіх астравоў, паведамляе BBC.

Найбуйнейшы брытанскі туратаратар Tui прыпыніў продаж турпуцёвак на курорты кантынентальнай часткі Іспаніі да 9 жніўня. Гэта звязана з тым, што ў Іспаніі ў пятніцу была зарэгістраваная новая ўспышка інфекцыі: як мінімум у 30 з 52 правінцый краіны колькасць інфіцыраваных расце. Сітуацыя ў Іспаніі выклікала занепакоенасць іншых дзяржаў Еўропы. Акрамя Брытаніі, каранцін для тых, хто вяртаецца з гэтай краіны, увяла Нарвегія, а ўлады Францыі параілі грамадзянам устрымацца ад наведвання Каталоніі.

## Воспу па Еўропе разнеслі вікінгі



Міжнародная група навукоўцаў выявіла сляды вірусаў натуральнай воспы ў зубах шкілетаў вікінгаў, даказаўшы, што смяротнасная хвароба з'явілася як мінімум 1400 гадоў таму. Пра гэта паведамляецца ў артыкуле, апублікаваным у часопісе Science.

Парэшткі з вірусам былі знойдзеныя на тэрыторыі Даніі, Нарвегіі, Расіі і Вялікабрытаніі, а таксама на востраве Эланд каля ўсходняга ўзбярэжжа Швецыі. Спецыялісты мяркуюць, што вікінгі, якія былі падарожнікамі і мараходамі, сталі носьбітамі воспы і распаўсюдзілі хваробу па ўсёй Еўропе і за яе межамі.

Гісторыкі лічылі, што воспа існавала 12 тысяч гадоў таму, аднак не было ніякіх важкіх доказаў, што людзі заражаліся вірусам да XVII стагоддзя. Навукоўцы пакуль не ведаюць, ці былі старажытныя штамы смяротнымі і ці стала хвароба непасрэднай прычынай гібелі вікінгаў.

# «Калі працуе РЭБ — сучасная тэхніка паралізуецца»

**ГЭТЫ выпуск «Плацдарма» незвычайны. Ён прысвечаны дзейнасці сістэмы радыёэлектроннай барацьбы. Дзякуючы сучасным прыладам можна пакінуць праціўніка цалкам без сувязі і навігацыі або паказваць на чужых радарах дзясяткі ілжывых цэляў, уводзячы тым самым яго ў зман. Рашэнні ў сферы радыёэлектроннай барацьбы з'яўляюцца закрытымі — краіны, якія робяць адпаведныя комплексы, вельмі неахвотна пастаўляюць свае напрацоўкі на экспарт. Як правіла, гаворка ў такіх выпадках ідзе пра тыя комплексы, якія ўжо нейкі час працавалі і былі выведзены з эксплуатацыі па прычыне маральнага зносу — развіццё РЭБ ідзе следам за стварэннем новых беспілотных комплексаў і сродкаў сувязі. Беларусь жа здолела стварыць тэхніку, якая нічым не саступае сусветным аналагам.**



Людзі, якія засталі савецкую эпоху, памятаюць на кароткіх хвалях так званыя «глушылкі» — генератары перашкод, якія перакрывалі сігналы з заходніх радыёстанцый. Гэта быў адзін з нямногіх прыкладаў выкарыстання радыёэлектроннай барацьбы, бачны шырокай публіцы. З цягам часу «глушылкі» сышлі ў нябыт, а вось неабходнасць РЭБ толькі ўзмацнілася. Бо задача гэтых войскаў — зрабіць так, каб тэхніка патэнцыйнага праціўніка была выведзена са строю на як мага далейшай адлегласці. Падрабязней пра гэта расказаў **начальнік службы радыёэлектроннай барацьбы Галоўнага штаба ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны Аляксандр НАГАВІЦЫН.**

— Сучасныя тэхналогіі развіваюцца імкліва, а разам з імі — і Узброеныя Сілы. Мы таксама не стаім на месцы, сочым за прагрэсам у галіне сістэм сувязі, радыёэлектроннага абсталявання. І таму перыядычна закупляем новыя станцыі для ўласнага выкарыстання, якія могуць ствараць перашкоды для каналаў перадачы даных патэнцыйнага праціўніка. Напрыклад, апошнім часам у 16-ы полк РЭБ паступіла самая сучасная станцыя «Навальніца». На яе ўскладзены вялікі спектр задач. Усё абсталяванне злучана ў адным комплексе, раней жа для гэтага патрабавалася ад трох да пяці агрэгатаў. Радуе, што ўся элементная база і складовыя часткі зроблены нашымі прадпрыемствамі. Акрамя таго, у 16-ы полк паступілі мабільныя комплексы радыёманіторынгу. Яны прызначаны для вядзення комплекснага тэхнічнага кантролю ў нашых воінскіх часцях. Гэта дазваляе нам вызначаць задачы як радыёразведкі, радыёэлектроннай абароны, так і падаўлення. Да таго ж цяпер ідзе распрацоўка новых станцый. У найбліжэйшыя гады яны таксама паступяць на ўзбраенне ў выпадку паспяховых выпрабаванняў, прычым таксама будуць цалкам беларускай вытворчасці. Таму можна сказаць, што канцэпцыя будаўніцтва і развіцця сістэмы радыёэлектроннай барацьбы, якая існавала ў Беларусі да 2020 года, выканана. І больш за тое, вызначана новая канцэпцыя дзеяннем на наступныя пяць гадоў.

***— Наколькі ўвогуле хутка ідзе абнаўленне тэхнікі?***

— Доўгі час асноўным дыяпазонам для сувязі былі кароткія хвалі. З цягам часу ён пашырыўся — адпаведна, трэба было ствараць адказ для магчымасці процідзеяння. Сёння ж на ўсіх самалётах стаяць сістэмы навігацыі і комплексы бартавога радыёэлектроннага абсталявання, якія вядуць разведку, забяспечваюць палёты на гранічна малых вышынях, наводзяць зброю — у залежнасці ад прызначэння апарата. Дзенідзе выкарыстоўваецца і спадарожнікавая сувязь.

Мы працуем у цеснай звязцы з войскамі сувязі, авіяцыяй (у тым ліку і беспілотнай), зенітна-ракетнымі і радыётэхнічнымі войскамі. Пастаўлена задача — умець змагацца супраць усяго, што працуе ў эфіры, гэта значыць засекчы, запеленгаваць і падавіць. Што да беспілотніка — перахапіць кіраванне, падавіць каналы навігацыі і тэлеметрыі. Радыёразведка засякае самі гэтыя каналы і выпраменьванне, у тым ліку на вялікай адлегласці. Фактычна гэта пеленгацыя, якая паказана ў старых ваенных фільмах, але з тых часоў яна прасунулася далёка наперад. Акрамя таго, мы мусім умець супрацьдзейнічаць рою беспілотнікаў. Напрыклад, што рабіць, калі на вашы пазіцыі ляцяць сотня аднаразовых апаратаў кустарнай вытворчасці? Комплекс супрацьпаветранай абароны абстраляць адначасова іх усе не здольны фізічна. Стварацъ іх можна ў вялікай колькасці дзякуючы нізкаму сабекошту. А вось калі ўключыць перашкоду ва ўсім дыяпазоне сістэмы кіравання, то ўсе беспілотнікі тут жа ўпадуць уніз і ператворацца ў металалом. Натуральна, пры гэтым трэба не заглушыць сваіх.

Супрацьстаянне падчас радыёэлектроннай барацьбы ідзе ў спектры частот, якія немагчыма ўбачыць ці пачуць чалавеку. Але падчас яго самалёт не можа ўзняцца ў паветра, ракета — вылецець са сваёй установкі. Ды і сувязь, навігацыя таксама губляюцца. Як вынік — сучасны, нашпігаваны супермагутнай тэхнікай самалёт ці верталёт ператвараецца ў просты паветраны карабель, не здольны нанесці шкоду. Кшталту АН-2, вядомага «кукурузніка».

***— Да 2012 года падраздзяленні радыёэлектроннай барацьбы былі раскіданы па краіне. Восем гадоў таму іх аб'ядналі ў адзіны 16-ы полк. Наколькі дапамагла цэнтралізацыя?***

— Самае галоўнае — любому вайсковаму падраздзяленню прасцей выконваць комплексныя задачы, калі яно знаходзіцца пад адзіным камандаваннем. Для асабовага складу — меншая нагрузка ў плане нарад. Большыя перспектывы кар'ернага росту для выпускнікоў Ваеннай акадэміі — спецыялістаў у галіне радыёэлектроннай барацьбы рыхтуюць на факультэце ваеннай разведкі. Зноў жа, стаяць пытанні забеспячэння. Калі часць не раскідана па ўсёй Беларусі, а знаходзіцца ў адным месцы, яе лягчэй забяспечваць гаручазмазачнымі матэрыяламі, рэчамі, харчаваннем. Зноў жа, для сем'яў афіцэраў можна ствараць інфраструктуру, каб заахвочваць іх працягваць службу, — будаваць дзіцячыя садкі, школы і, урэшце, жыллё.

Таму 2012 год і лічыцца адпраўным пунктам сучаснай сістэмы радыёэлектроннай барацьбы Беларусі. Аналагічная вайсковага фарміравання, здольнага вырашаць падобны комплекс задач па радыёэлектроннай барацьбе ў інтарэсах войскаў ВПС і ППА, няма ва ўсіх Узброеных Сілах. Як толькі 16-ы полк быў сфарміраваны, яго ўкамплектавалі самай сучаснай тэхнікай. Шмат у чым яна актуальная і сёння.

Напярэдадні

## Ідзе падрыхтоўка да Гульняў

Гэтымі днямі каманды Узброеных Сіл Беларусі рыхтуюцца да конкурсаў «Армейскіх міжнародных гульняў—2020». Сваё майстэрства яны адточваюць на 174-м вучэбным палігоне ВПС і войскаў ППА «Даманава». Яго наведаў **міністр абароны генерал-маёр Віктар ХРЭНІН.** Пра гэта паведамляе прэс-служба Міністэрства абароны.

Там трэніруюцца вайскоўцы, якія прадставяць Беларусь у трох намінацыях — «Танкавы біятлон», «Сувораўскі націск» і «Чыстае неба». Перашкоды на мясцовай трасе максімальна набліжаны да тых, на якіх трэба будзе выступаць нашым экіпажам і разлікам.

Па словах міністра абароны, беларусы будуць удзельнічаць у 21 конкурсе Гульняў.

— Сістэма падрыхтоўкі да іх трывала ўбудавана ў баявую падрыхтоўку практычна ўсіх відаў Узброеных Сіл, — адзначыў Віктар Хрэнін. — Яна вядзецца з пачатку навучальнага года і на ўсіх этапах зладжвання. Былі адабраны найлепшыя вайскоўцы па выніках конкурсаў у сваіх вайсковых часцях, камандаваннях. Таму рост узроўню падрыхтоўкі падраздзяленняў у цэлым для нас не менш важны, чым прызавыя месцы.

З нагоды

## І БТР станцуе на вадзе

Першыя два дні жніўня ў Беларусі будуць святкаваць юбілей паветрана-дэсантныя войскі. Са дня іх стварэння споўніцца 90 гадоў — і юбілей абавязкова будзе адзначаны. Напярэдадні свята к**амандуючы сіламі спецыяльных аперацый Узброеных Сіл генерал-маёр Вадзім ДЗЕНІСЕНКА** расказаў пра тое, якія ж мерапрыемствы запланаваны ў Мінску.

— 1 жніўня каля Палаца спорту аб 11-й гадзіне пачнецца святочная праграма. Гэта вальс БТР на вадзе, дэсантаванне на зямлю і ваду. Таксама мы пакажам новае адзенне і зброю, пройдуць шматлікія спартыўныя спаборніцтвы і паказальныя выступленні па рукапашным баі і гарадскім альпінізме. Свае навыкі пакажуць і баявыя плыўцы.

У гэты ж дзень адбудзецца ўрачысты сход у Цэнтральным доме афіцэраў.

— Мы спецыяльна да гэтага рыхтаваліся на працягу двух гадоў, вывялі нумары, праводзілі конкурсы. Адбудуцца канцэрт, выстаўка дзіцячых малюнкаў. Пакажам і «Міс сіл спецыяльных аперацый», — дадаў Вадзім Дзенісенка.

2 жніўня ў злучэннях і воінскіх часцях сіл спецыяльных аперацый у Брэсце, Мар'інай Горцы і Віцебску святкаванне працягнецца.

— Мы запрашаем сюды ўсіх, хто цікавіцца нашай тэмай, хто служыў ці яшчэ будзе служыць, — дадаў Вадзім Дзенісенка. — Прыходзьце на нашы пляцоўкі і бярыце з сабой дзяцей. Будзе вельмі цікава.

* * *

У сувязі з падрыхтоўкай да святочных мерапрыемстваў з 25 ліпеня да 2 жніўня па аўтамабільных дарогах агульнага карыстання будуць ісці калоны колавай ваеннай і спецыяльнай тэхнікі. 26 ліпеня адбылася рэпетыцыя каля Палаца спорту.

Тэхніка будзе рухацца і 2 жніўня ў Мар'інай Горцы — па вуліцах Новая Зара і Ленінская з 7 да 8 і з 15 да 16 гадзін.

1 жніўня пасля завяршэння святочных мерапрыемстваў плануецца вяртанне асабовага складу і тэхнікі ў пункты пастаяннай дыслакацыі. Інфармацыя пра час і маршруты руху будзе размешчана дадаткова.

ДАІ і ВАІ рэкамендуюць удзельнікам дарожнага руху павысіць пільнасць і выконваць Правілы дарожнага руху.



Фота БелТА.

**26 ліпеня ў Беларусі адзначылі дзень ваенна-марскога флоту. Ён традыцыйна прыпадае на апошнюю нядзелю ліпеня. Хоць у нашай краіне выхаду да мора няма, але маракі ў нас жывуць — тыя, якія звязалі свой лёс з флотам СССР, а пасля іншых постсавецкіх рэспублік і пасля заканчэння службы вярнуліся ў Беларусь.**

## МАРАКІ АДЗНАЧЫЛІ СВЯТА

Асноўныя пляцоўкі святкавання разгарнуліся ў Мінску, Гомелі і Светлагорску.

У сталіцы каля стэлы «Мінск — горад-герой» сабраліся афіцэры, мічманы, старшыны, матросы ў запасе і адстаўцы, а таксама члены іх сем'яў. У сталіцы маракі ўсклалі кветкі да помніка загінулым воінам, правялі ўрачысты мітынг і ўшанавалі хвілінай маўчання памяць загінулых і памерлых вайскоўцаў.

А ў Светлагорску быў адкрыты памятны знак «Братэрства чатырох флатоў». Ён усталяваны на набярэжнай Бярэзіны па ініцыятыве ветэранскай арганізацыі былых ваеннаслужачых ваенна-марскога флоту пры падтрымцы раённых улад, прадпрыемстваў і арганізацый горада. На пастаменце ў цэнтры кампазіцыі размешчаны два якары, паміж імі — знак таварыства Ваенна-марскога флоту. Паабапал усталяваны шыльды з указаннем флатоў, якія існавалі ў Савецкім Саюзе, — Балтыйскага, Чарнаморскага, Ціхаакіянскага, Паўночнага.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Узровень

# ВЫЯВІЦЬ, ЗАПЕЛЕНГАВАЦЬ І НЕЙТРАЛІЗАВАЦЬ

6 ліпеня восьмы дзень нараджэння адзначыў 16-ы асобны полк радыёэлектроннай барацьбы (з самалётнымі сродкамі). Часць для нашай краіны ўнікальная — больш ніхто не можа выконваць аналагічныя задачы, каб прымусіць замаўчаць радыёэлектронную апаратуру патэнцыйнага праціўніка. Але чым жа яна жыве? Каб гэта высветліць, карэспандэнт «Звязды» адправіўся ў Бярозу.



Палкоўнік Юлій ГВОЗДЗЬ.

...Першы і зараз дзеючы **камандзір палка — палкоўнік Юлій ГВОЗДЗЬ** — з гонарам пералічвае яго дасягненні на вучэннях, у тым ліку спаборніцтвах на палявой вывучцы сярод падраздзяленняў радыёэлектроннай барацьбы Узброеных Сіл Расіі. Гэтыя спаборніцтвы амаль заўжды ўнутрырасійскія, і толькі зрэдку на іх запрашаюць каманды дзяржаў-саюзніц.

— Мы тройчы ездзілі ў Расію і ўсе тры разы займалі або другое, або першае месца, — згадвае Юлій Гвоздзь. — Пры гэтым у нас усяго адзін полк радыёэлектроннай барацьбы з самалётнымі сродкамі, а вось з расійскага боку ўдзельнічала паўтара дзясятка брыгад, якія да таго ж маюць рэальны баявы досвед. Ад таго, як разгортваюцца нашы вайскоўцы, расіяне засталіся пад моцным уражаннем і нават прапанавалі зняць вучэбны фільм для ўласных экіпажаў. Гэта многага каштуе.

Сакрэт поспеху палка — гэта не толькі тэхніка, але і вельмі кваліфікаваны асабовы склад.

— Наша дзейнасць не такая відовішчная на першы погляд, як у тых жа лётчыкаў, але сувымерная па важнасці, — кажа Юлій Гвоздзь. — Мы зацікаўлены ў тым, каб да нас прыходзілі служыць спецыялісты, падрыхтаваныя ў найлепшых тэхнічных ВНУ краіны і, канешне ж, у Ваеннай акадэміі. З апошняй мы трывала супрацоўнічаем, і мушу адзначыць, што ўзровень падрыхтоўкі выпускнікоў істотна вырас.

Але адна справа, калі на тэхніцы працуе афіцэр, які вучыўся гэтаму пяць гадоў і ішоў паступаць мэтанакіравана. Іншая — салдат тэрміновай службы. Добра яшчэ, калі ён засвоіў тэхнічную спецыяльнасць. А што рабіць, калі баец — заўзяты гуманітарый?

— Магу прывесці два прыклады, — прапануе Юлій Гвоздзь. — У нас быў салдат з Белаазёрска, які звольніўся паўтара года таму. Ён скончыў БДУІР і усё схопліваў літаральна на ляту. А, напрыклад, адзін з нашых аператараў станцыі па адукацыі — выкладчык замежнай мовы. Ён калісьці трапіў да нас на тэрміновую службу. І ў выніку застаўся на другі кантракт запар. Як бачыце, тое, што чалавек — гуманітарый, не перашкода. Уся справа насамрэч у наяўнасці добрага аналітычнага мыслення. Пры гэтым трэба адзначыць, што чалавеку з вышэйшай радыётэхнічнай адукацыяй будзе, натуральна, прасцей асвойвацца.

Сёлета каля чвэрці звольненых з палка ў запас салдат тэрміновай службы паступілі на кантрактную службу. Калісьці гэты шлях прайшоў і **начальнік станцыі старшы прапаршчык Аляксандр ЯЧНІК:**

— Сёлета споўнілася дзесяць гадоў, як я служу тут. Прыйшоў на тэрміновую службу ў 16-ы асобны батальён РЭБ, на базе якога быў пасля сфарміраваны гэты полк, ды так і застаўся. Было спачатку крыху боязна — брат служыў у танкавых войсках, а што такое радыёэлектронная барацьба, нават і спытаць не было каго. Інтэрнэт у тыя часы быў яшчэ не такі дасяжны, як цяпер. Але пакрысе асвоіўся. За гэты час мы атрымалі шмат новай тэхнікі, на якой вельмі цікава працаваць. Што да навучання асабовага складу, то, натуральна, людзі бываюць розныя. Нярэдка сутыкаюся з тым, што інфармацыю схопліваюць літаральна на ляту, а ў вачах заўважны агеньчык непадробнага інтарэсу. Прынцып добрасумленнасці дзейнічае ў абодва бакі — калі салдат добра выконвае пастаўленыя задачы, то ён атрымлівае ў якасці заахвочвання дадатковыя дні да водпуску або звальненні на некалькі сутак.



Капліца.

Аляксандр Ячнік плануе стаць афіцэрам. Кажа, што не хоча спыняцца на званні старшага прапаршчыка.

На ўездзе ў часць усталявана стэла, на якой выбіты тры словы — «разведаць, падавіць, абараніць». Так можна коратка сфармуляваць асноўныя задачы палка. Рабіць гэта на найвышэйшым узроўні дапамагло стварэнне яго на базе батальёнаў радыёэлектроннай барацьбы, якія існавалі раней. Як вынік — на ўсіх вучэннях з сіламі радыёэлектроннай барацьбы пад кіраўніцтвам начальніка ўпраўлення радыёэлектроннай барацьбы Генеральнага штаба Узброеных Сіл полк ацэньваўся на «добра». Больш за тое, цягам шасці апошніх навучальных гадоў 16-ы асобны полк радыёэлектроннай барацьбы чатыры разы прызнаваўся найлепшай воінскай часцю баявога забеспячэння ў Ваенна-паветраных сілах і войсках супрацьпаветранай абароны. Тры разы з іх — запар.

— У нас праходзіць вельмі шмат вучэнняў на розных узроўнях, у тым ліку і з іншымі родамі і відамі войск, — працягвае Юлій Гвоздзь. — На іх мы працуем у абстаноўцы, максімальна набліжанай да рэальнай баявой. Афіцэр радыёэлектроннай барацьбы мусіць пастаянна вучыцца. Асаблівa гэта важна з прычыны таго, што тыпы ваенных канфліктаў мяняюцца. Яны становяцца гібрыднымі і вымагаюць выкарыстання ўсё больш «разумнай» тэхнікі. Вось, напрыклад, у Вялікую Айчынную нават не на ўсіх самалётах былі ўстаноўлены кароткахвалевыя перадатчыкі. Цяпер жа няма ніводнага ўзору тэхнікі, не абсталяванага сувяззю. А дзе варожая сувязь — там і мы, тыя, хто мусіць ёй процідзейнічаць. І калі афіцэр, не звязаны з намі, бачыць на свае вочы, што пілот суперсучаснага самалёта не можа «злавіць» цэль дзякуючы нам, — паверце, гэта ўражвае. Неяк увогуле адбыўся паказальны выпадак. Салдат апошняга перыяду службы ў вольны час выклаў з шышак надпіс «РЭБ — гэта сіла!» Пэўна, мы яму нешта такое прывілі...



На вучэннях.

Восем гадоў таму полк фарміраваўся не на голым месцы. Так, былі і казармы, і памяшканні для захоўвання тэхнікі, і клуб, але... усё гэта патрабавала капітальнага рамонту. Ён быў грунтоўна праведзены. Сярод выгод, якія з'явіліся, — гарачая вада ў кожнай казарме і сучасныя санітарныя вузлы.

Кожны звольнены ў запас запаўняе спецыяльную анкету, у якой яго просяць выказацца аб месцы службы. Юлій Гвоздзь зазначае, што негатыўных водгукаў не было ні разу. А бываюць і зусім нечаканыя гісторыі.

— Адзін з падначаленых салдат завяршаў тэрмін службы, калі яму было амаль 27 гадоў, — расказвае **камандзір узвода старшы лейтэнант Кірыл ВАЛІЦКІ.** — Ён пасля школы працаваў у мясцовым СПК, пасля падаўся ў сферу жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Чалавек сямейны. Адслужыў у нас год, за гэты час вельмі добра сябе зарэкамендаваў. І захацеў застацца на кантракт. Так чалавек знайшоў сябе. Вельмі прыемна назіраць, як людзі, з якімі ты сутыкаешся штодня, істотна прагрэсуюць. Ды і індывідуальны падыход ніхто не адмяняў.

Кірыл Валіцкі згадвае сваё першае баявое дзяжурства. Ён параўноўвае яго з караулам, дзе даводзіцца прыслухоўвацца да кожнага шолаху. І толькі калі зняніўся, то ўсвядоміў, якая ўсё-такі была ўскладзена адказнасць.

— Я служу пасля Ваеннай акадэміі крыху больш за год, але каб нешта паўтаралася кожны дзень, станавілася руцінай — такога няма. Усё вельмі разнастайна і часам нечакана.

Не забываюцца ў палку і на духоўны складнік. Тут дзейнічае капліца свяшчэннамучаніка Сергія Фларынскага. Перыядычна сюды прыязджае святар. Але чаму памяць менавіта Сергія Фларынскага ўшаноўваецца ў Бярозе?

— З 1894 года тут базіраваўся 151-ы Пяцігорскі пяхотны полк. Святаром у ім быў Сергій Фларынскі, — расказвае **інструктар па арганізацыйна-масавай рабоце Валерый НЯПАРКА.** — Ён браў удзел у руска-японскай вайне, ваяваў і падчас Першай сусветнай. Меў некалькі ўзнагарод — медалёў і ордэнаў. А вось лёс у Сергія Фларынскага аказаўся вельмі трагічны. У 1918 годзе ён апынуўся ў горадзе Ракверэ. Гэта сучасная Эстонія. На частцы яе тэрыторыі была абвешчана Эстляндская працоўная камуна, і 16 снежня 1918-га войскі Чырвонай Арміі занялі горад. Праз тры дні протаіерэй Сергій быў арыштаваны як прадстаўнік старога рэакцыйнага рэжыму. Яго абвінавачвалі і ў арганізацыі барацьбы супраць савецкіх войскаў. 20 снежня ён быў дапытаны, і праз шэсць дзён вынеслі смяротны прысуд. Пратакол допыту заняў усяго адну старонку тэксту, напісанага ад рукі. Напрыканцы яго Сергій Фларынскі напісаў: «Лічу адно: віна мая ў тым, што я святар, у чым і распісваюся».

У 2002 годзе Сергій Фларынскі быў прылічаны Рускай Праваслаўнай Царквой да ліку свяшчэннамучанікаў для агульнацаркоўнага шанавання. Эксгумацыя астанкаў святара адбылася ў 2003 годзе. І высветлілася, што большая частка яго цела захавалася...

*г. Бяроза.*

Матэрыялы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

## ОАО «БНБ-Банк»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а.

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2020 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Сим-вол | 01.07.2020 | 01.01.2020 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 17 487 | 11 624 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 108 228 | 126 235 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 28 282 | 27 823 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 88 446 | 71 880 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 473 751 | 405 862 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 732 | 2 007 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 306 | 306 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 19 850 | 20 060 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 6 745 | 9 763 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 1 620 | 1 702 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 477 | 511 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 4 370 | 4 122 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 750 294 | 681 895 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 74 465 | 47 212 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 541 602 | 500 269 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 42 793 | 49 018 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 1 993 | 51 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 2 585 | 3 040 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 663 438 | 599 590 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 27 688 | 27 688 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 10 419 | 7 153 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 13 238 | 13 529 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 35 511 | 33 935 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 86 856 | 82 305 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 750 294 | 681 895 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2020 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Сим-вол | 01.07.2020 | 01.07.2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 24 898 | 19 294 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 14 158 | 10 611 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 10 740 | 8 683 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 7 128 | 7 082 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 745 | 1 491 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 5 383 | 5 591 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (146) | (176) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 8 361 | 4 077 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (853) | 1 851 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 4 702 | 1 039 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 4 757 | 3 737 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 16 674 | 16 311 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 1 274 | 1 007 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 5 592 | 5 406 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 042 | 893 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 4 550 | 4 513 |

Заместитель
Генерального директора С.К. Сабук

Главный бухгалтер Н.П. Шнип

Дата подписания: 02 июля 2020 г.

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка: **https://www.bnb.by/**

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь № 10 от 7 июня 2013 г. УНП 100513485.

---

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ**

ЛОТ № 1: капитальное строение с инвентарным номером 401/С-33709 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Жемчужина» с кондитерским цехом), общей площадью 961,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 36.
Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 422050400002002204, площадью 0,2193 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания магазина «Жемчужина» и кондитерского цеха), расположенном по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 36.
Начальная цена продажи лота – 621 120 руб. (шестьсот двадцать одна тысяча сто двадцать рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 62 112 руб. (шестьдесят две тысячи сто двенадцать рублей)

ЛОТ № 3: капитальное строение с инвентарным номером 401/С-30427 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), общей площадью 79,4 кв. м, расположенное по адресу: Скидельский с/с, д. Бондари.
Лот № 3 расположен на земельном участке кадастровый № 422088502601000081, площадью 0,0578 га (назначение – для размещения магазина), расположенном по адресу: Скидельский с/с, д. Бондари.
Начальная цена продажи лота – 9 960 руб. (девять тысяч девятьсот шестьдесят рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 996 руб. (девятьсот девяносто шесть рублей)

Условия проведения аукциона: аукцион без условий

**Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Гродненский филиал), 230003, г. Гродно, ул. Озерское Шоссе, 41, тел. 39-29-90**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия оплаты: по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 10 августа 2020 г. в 11.00**
**по адресу:**
**Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.05.2020 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18

**Последний день приема заявлений – 06 августа 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

---

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

ЛОТ № 1: капитальное строение с инвентарным номером 400/С-28239 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 75,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Путришковский с/с, д. Каменная Русота

Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 422088003601000007, площадью 0,0619 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Путришковский с/с, д. Каменная Русота. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохраной зоне водного объекта вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,0619 га

Начальная цена продажи – 15 240 руб. (пятнадцать тысяч двести сорок рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 1 524 руб. (одна тысяча пятьсот двадцать четыре рубля)

Условия проведения аукциона: аукцион без условий

**Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Гродненский филиал), 230003, г. Гродно, ул. Озерское Шоссе, 41, тел. 39-29-90**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия оплаты: по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 10 августа 2020 г. в 11.00**
**по адресу:**
**Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 30.05.2020 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18

**Последний день приема заявлений – 06 августа 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**информирует о проведении открытого аукциона**
**по продаже имущества,**
**принадлежащего РУП «БЕЛПОЧТА» (Продавец)**

**Лот № 1:** отделение перевозки почты с инв. № 630/D-47106, 792,9 кв. м. **Адрес:** Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Вокзальная, д. 1А, помещение 2. **Начальная цена без НДС** – 215 000,00 руб. Аукцион состоится **28.08.2020 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4. Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by** и Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

# «Мэта 99. Дом без адходаў»



## Серыял пра айчыннае смецце запусцілі на Youtube

**Якая ўпакоўка шкодная, куды знікае смецце са смеццявоза, як даць адходам другое жыццё? На гэтыя і іншыя пытанні адказы даюцца ў дакументальным навукова-папулярным серыяле «Мэта 99. Дом без адходаў». Першыя пяць серый з дзесяці ўжо змешчаны на youtube-канале «Рух «Мэта 99».**

Героі серыяла — кіраўнікі ведамстваў і міністэрстваў, спецыялісты галіны, перапрацоўшчыкі, эксперты, эколагі, а таксама казачны Янот — дапамагаюць прагледзець стаўленне да смецця і самастойна выбраць, куды прывядуць звычкі кожнага з нас: на звалку ці ў дом без адходаў.

Серыял здымалі па заказе прадпрыемства «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» і Міністэрства ЖКГ краіны на айчынных прадпрыемствах, якія займаюцца зборам, сарціроўкай і перапрацоўкай адходаў, а таксама на заводах, якія выкарыстоўваюць другасную сыравіну для вырабу новай прадукцыі. Гэта прадпрыемствы «Экарэс», Гродзенскі завод па ўтылізацыі і механічнай сарціроўцы адходаў, «Шклосфера», Брэсцкі смеццеперапрацоўчы завод, «Спецкамунаўтатранс» і іншыя, расказала **Наталля ГРЫНЦЭВІЧ, дырэктар дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў»**:

— *Мэта серыяла — паказаць, як працуе сістэма абыходжання з камунальнымі адходамі ў Беларусі, расказаць пра важнасць сарціроўкі, пра перапрацоўку і перапрацоўшчыкаў, людзей, якія робяць свет чысцейшым. Глядзіце серыял, пазнавайце новае і фарміруйце карысныя звычкі.*

Пакуль гледачы могуць пабачыць серыі «Палігоны і звалкі», «Папера — дзеля паперы?», «Шкло — не пясок», «Пластык — праблема?», «Хлам — адваротны бок прагрэсу». А ў далейшым яны пазнаёмяцца з небяспечнымі адходамі, убачаць смеццевую гаспадарку краіны знутры і даведаюцца яшчэ шмат пра што цікавае.

**Ірына СІДАРОК.**

---

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

ЛОТ № 1: изолированное помещение с инвентарным номером 401/D-15049 (назначение – торговое помещение, наименование – универмаг), общей площадью 1828,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Клубная, д. 1, кв. 2

Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 422050400001000657, площадью 0,2162 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания здания универмага), расположенном по адресу: г. Скидель, ул. Клубная, д. 1

Начальная цена продажи – 247 200 руб. (двести сорок семь тысяч двести рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 24 720 руб. (двадцать четыре тысячи семьсот двадцать рублей)

Условия проведения аукциона: аукцион без условий

**Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Гродненский филиал), 230003, г. Гродно, ул. Озерское Шоссе, 41, тел. 39-29-90**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия оплаты: по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 10 августа 2020 г. в 11.00**
**по адресу:**
**Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 14.04.2020 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18

**Последний день приема заявлений – 06 августа 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

---

**Частное унитарное предприятие по оказанию услуг «Класс-Ломбард»,**
регистрационный № 190994869, реорганизуется
в форме преобразования в общество с ограниченной ответственностью.
Претензии кредиторов принимаются по адресу:
ул. К. Либкнехта, д. 102, комн. 20, 220036, г. Минск.

УНП 190994869

На думку парламентарыя

# «ТРЭБА ТРЫМАЦЦА ЗА СВАЁ, ЗА СВАЕ КАРАНІ І ВЫТОКІ»

**Электаральная кампанія выразна акрэслівае людзей з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. Адной з такіх асоб з'яўляецца Лілія АНАНІЧ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання, намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын, медыяэксперт, якая раней займала пасаду міністра інфармацыі. У гэты насычаны грамадска-палітычнымі падзеямі час Лілія Станіславаўна пагутарыла з карэспандэнтам «Звязды» і падзялілася меркаваннямі па актуальных пытаннях.**



***— Найперш, Лілія Станіслаўна, адзначу вашу актыўнасць у сацыяльных сетках і дастаткова акрэсленыя меркаванні наконт падзей выбарчай кампаніі. Асобныя допісы выклікаюць значны грамадскі рэзананс і шырокае абмеркаванне ў, скажам так, альтэрнатыўнай медыяпрасторы. Ці не вынікае з гэтага, што электаральная кампанія ў плане інфармавання перамясцілася ў інтэрнэт?***

— У пэўным сэнсе так. І не толькі ў плане інфармавання. На нашых вачах — памкненне разгарнуць вядомы па замежных дзеях сцэнарый «каляровых рэвалюцый». Нават і колер агучаны. Таму нельга маўкліва ўспрымаць спробы разгайдаць нашу чыстую Беларусь — краіну, у падмурку якой гераічнае мінулае і надзеі нашых продкаў; краіну, паважаную ў свеце, якая адбылася ў няпростых геапалітычных умовах дзякуючы нястомнай працы народа і мудрасці палітыкі нашага Прэзідэнта.

***— Дарэчы, больш чым паўгода вы прадстаўляеце інтарэсы жыхароў Барысаўшчыны ў якасці дэпутата Палаты прадстаўнікоў 7-га склікання. У канцы чэрвеня скончылася другая сесія парламента. Для грамадства яна вызначылася прыняццем у першым чытанні новых адміністрацыйнага і адміністрацыйна-выканаўчага кодэксаў, якія абнавілі ў кароткія тэрміны, ратыфікацыяй пагаднення з ЕС аб спрашчэнні выдачы віз, прыняццем законапраекта аб амністыі да 75-годдзя Перамогі, узгадненнем новага прэм'ер-міністра, прызначэннем даты прэзідэнцкіх выбараў. Чым для вас асаблівая гэтая сесія?***

— Яшчэ б дадала больш за 30 ратыфікаваных пагадненняў, якія будуць развіваць міжнародныя адносіны. Таксама прынятыя ў першым чытанні законы «Аб правах інвалідаў і іх рэабілітацыі», «Аб ахове здароўя», «Аб грамадзянстве» і іншыя. Калі мы кажам пра КААП і ПВКААП, важна, што гэта даручэнне кіраўніка дзяржавы і курс нашай краіны на лібералізацыю заканадаўства. Па выніках другой сесіі прапрацоўку прайшлі законы, што прымаліся гадоў 8—10 таму. Напрыклад, я асабіста адказвала за дапрацоўку ў нашай камісіі на другое чытанне законапраекта «Аб Беларускім Таварыстве Чырвонага Крыжа». Натуральна, што сумесна з органамі дзяржаўнага кіравання адпрацоўваюцца і новыя законапраекты, найперш у эканамічным блоку, актуальныя для далейшага развіцця краіны. Усё, што робіцца ў заканадаўчай сферы, скіравана на патрэбы грамадства і канкрэтнага чалавека. Дарэчы, менавіта падчас работы ў рэгіёне і вылучаюцца дэпутатам канкрэтныя пытанні гаспадарчых суб'ектаў, грамадзян, якія патрабуюць у пэўных выпадках і заканадаўчага погляду.

***— Падзяліцеся з нашымі чытачамі, якія заканатворчыя планы ў дэпутацкага корпуса на будучыню.***

— На асеннюю сесію рыхтуецца цэлы шэраг законапраектаў, у тым ліку і эканамічнага складніка. Усе яны адпрацоўваюцца ў пастаянных камісіях і кожным дэпутатам. У нашай камісіі да другога чытання на асеннюю сесію рыхтуецца законапраект «Аб грамадзянстве». На маім рабочым стале зараз і дзеючы закон (прыняты ў 2012 годзе) «Аб выдавецкай дзейнасці». На мой погляд, з мінулага вопыту (мела дачыненне да яго распрацоўкі) і з ведання спраў у галіне выдавецкай супольнасці асобныя яго палажэнні патрабуюць дапрацоўкі з мэтай уліку сучасных тэндэнцый і патрэб. Напрыклад, такіх як адлюстраванне тэмы электроннага кнігавыдання, ахова аўтарскіх правоў у інтэрнэце, дзяржаўная падтрымка нацыянальнага кнігавыдання і распаўсюджвання друку. Тут наперадзе цэлы абсяг работы з галіновымі міністэрствамі і грамадскімі аб'яднаннямі. Лічу вельмі важным дэталёвы разгляд інфармацыйнага заканадаўства на прадмет эфектыўнага рэгулявання распаўсюджвання інфармацыі ў так званых новых медыя. Тэхналагічная сфера нараджае новыя асяродкі распаўсюджвання інфармацыі. Тое, што адбываецца зараз у сацыяльных сетках, — яскравае сведчанне негатыўнага ўплыву сацыяльных медыя на сітуацыю ў краіне падчас электаральнай кампаніі. А гэта ўжо пытанне інфармацыйнай бяспекі. Заканадаўства аб інфармацыі і СМІ, як і любое іншае, не можа быць застылым.

***— Некалькі слоў пра вашу грамадскую дзейнасць. Беларускі саюз жанчын, у кіраўніцтва якога вы ўваходзіце, актыўна ўключыўся ў выбарчую кампанію. Яго члены збіралі подпісы, увайшлі ў склад выбарчых камісій, удзельнічаюць у рабоце грамадскіх прыёмных.***

— Наша грамадская арганізацыя прыняла адназначнае рашэнне аб падтрымцы на выбарах Прэзідэнта краіны кандыдатуры дзеючага кіраўніка дзяржавы Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі. Мы падтрымліваем сацыяльны кірунак развіцця краіны, той шлях, які абраны беларускім народам і дае свой плён. Наша пазіцыя грунтуецца і на тых шматлікіх ініцыятывах, якія ўносіліся і падтрымліваліся на дзяржаўным узроўні па развіцці сацыяльнай сферы, сямейнай палітыкі. Прывяду толькі адзін прыклад. У сусветным рэйтынгу краін, спрыяльных для мацярынства і нараджэння дзяцей, Беларусь сёння займае 25-ю пазіцыю з 178, прычым у СНД мы на першым месцы. Хіба ж гэта не дасягненне? І такія прыклады можна працягваць. Вядома ж, апаненты ўлады такія прыклады «не заўважаюць».

***— Пацікаўлюся ў вас як медыяэксперта: як вы адносіцеся да таго, што адбываецца ў інфармацыйнай прасторы напярэдадні выбараў?***

— Гэтая выбарчая кампанія з самага пачатку стартавала з моцным выкарыстаннем новых медыя, новых тэхналогій. Благасфера і сацсеткі сталі актыўнымі гульцамі электаральнай кампаніі. На жаль, яны ў большасці не накіраваныя на тое, каб выбары адбыліся ў адпаведнасці з заканадаўствам. І ў гэтым угадваецца складнік умяшання ў нашы ўнутраныя справы. Я ніякім чынам не хачу сказаць, што грамадзяне не павінны выказвацца ў інтэрнэце. У нас адкрытае грамадства, адкрытае інфармацыйнае поле. Разам з тым мы бачым, што выкарыстоўваюцца зневажальныя пасылы, калі чалавек выказвае сваё адмоўнае стаўленне да дзеючай улады, пэўных асоб знарок зневажальна і агрэсіўна. Замест таго каб весці абгрунтаваную дыскусію ў прававым полі, пэўныя колы навязваюць грамадству адзіную думку — «улада не тая», «перамены». Якія перамены?! Пра гэта, як відаць з першых агітацыйных выступленняў ужо кандыдатаў і «выбарчых спадкаемцаў», пераканаўча расказаць не атрымліваецца. Таму, відавочна, і робіцца разлік на тое, каб дасягаць мэт, грэбуючы заканадаўствам.

***— Апошнім часам Прэзідэнт звяртаецца да актывістаў рэгіёнаў з заклікам, што яны павінны стаць лідарамі думак. Як дэпутаты імкнуцца камунікаваць са сваімі выбаршчыкамі, каб стаць для іх аўтарытэтам? З чым вы сёння ідзяце да людзей?***

— Я думаю, пазіцыя чалавека вынікае з яго дзейнасці. І не толькі ў час выбарчай кампаніі. Дадам, сёння важна думка і дэпутата, і кожнага грамадзяніна. Дарэчы, цяпер працую ў рэгіёне, штодзень сустракаюся з людзьмі, і вельмі радуе, што рэальнае жыццё, памкненні людзей значна багацейшыя на колеры, чым малюецца інтэрнэтам. Яны ўсё ж у большасці сваёй стваральныя, а не разбуральныя. Скажу больш: яны, а не інтэрнэт-тэхналогіі, вызначаюць кірунак далейшага развіцця краіны. Магчыма, паўтаруся, але дадам. Я не магу быць раўнадушнай, і мой жыццёвы вопыт дазваляе рабіць ацэнкі. Я памятаю, у мяне на руках былі малыя дзеці, калі аб'явілі пра распад Савецкага Саюза. Паўставала пытанне: як жыць? Раней вялікая краіна была для нас крэпасцю. Цяпер наша Беларусь — крэпасць беларускага народа. Колькі зроблена, колькі пройдзена! Мы сапраўды пабудавалі краіну для жыцця. Нам ёсць што абараняць і ўзбагачаць — нашы традыцыі і каштоўнасці, сацыяльны курс развіцця, пераемнасць пакаленняў і клопат пра тых, хто мае патрэбу ў дапамозе, плённую працу дзеля будучыні ў ладзе і згодзе. Нам ні ў якім выпадку нельга дапускаць «чужыя ветры» ў свой дом — садзьмуць, і следу не застанецца. Трэба трымацца за сваё, за свае карані і вытокі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# «Калі ты працуеш, не можа быць, каб ты дрэнна жыў...»

**Грыгор АДАМЯН, старшыня Гродзенскага рэгіянальнага аб'яднання армян «Мусалер», прадпрымальнік:**

— Вось ужо сорак гадоў, як я лічу Беларусь сваім родным домам. Прыехаць сюды мне параілі вайсковыя сябры, і я ні разу не пашкадаваў аб гэтым. Мне адразу спадабалася гэтая зямля, людзі, што тут жывуць. Тут, у Беларусі, я атрымаў адукацыю, ажаніўся з беларускай, тут нарадзіліся мае трое сыноў. І яны ўжо напалову беларусы. У мяне ёсць ужо і ўнукі. Я стараўся выхаваць сваіх дзяцей так, каб яны прынасілі карысць не толькі сваёй сям'і, але і краіне. Так і адбылося. Я сам спартсмен, і сыны таксама з дзяцінства займаюцца барацьбой і выступаюць за Беларусь на міжнародных спаборніцтвах.



У іх гонар неаднойчы ўздымаўся беларускі сцяг і гучаў дзяржаўны гімн. Двое сыноў атрымалі вышэйшую адукацыю, малодшы неўзабаве скончыць юрыдычны факультэт ГрДУ.

У нас сямейны бізнес у Гродзенскім раёне. Мясцовыя ўлады выдзелілі 120 гектараў зямлі пад садаводства. На сваім вопыце ўпэўніўся — дзяржава падтрымлівае бізнес, ёсць магчымасць узяць крэдыт пад невялікі працэнт, ёсць падатковыя льготы. Закон дае магчымасць зарабіць, забяспечваць сям'ю і развіваць сваю справу. Галоўнае — добра працаваць і не парушаць закон. Калі ты працуеш, не можа быць, каб ты дрэнна жыў. Нам, хто жыве ў Беларусі, грэх скардзіцца. Тут ёсць усё для таго, каб жыць, працаваць, выхоўваць дзяцей і радавацца ўнукам.

За той час, што я тут жыву, бачу, якія станоўчыя змены адбываюцца ў краіне. Аднаўляюцца гарады і пасёлкі, відаць клопат пра простых людзей. Пры гэтым значная ўвага ўдзяляецца вытворчым аб'ектам. Гэта вельмі складана — захаваць такія магутнасці, як аўтамабільная вытворчасць. Цяпер у краіне выпускаюць амаль увесь патрэбны транспарт — ад трактароў, легкавых аўтамабіляў і да тралейбусаў, аўтобусаў, МАЗаў, БелАЗаў... Як бізнесмен ведаю, наколькі складана даецца развіццё такой канкурэнтнай прадукцыі. Але без сваёй індустрыяльнай базы цяжка будаваць краіну. І гэта трэба захаваць, каб ісці далей. Крок за крокам...

У Беларусі жыве нямала армян. Мы ствараем свае грамадскія аб'яднанні, захоўваем сваю мову і культуру. Заўсёды бяром удзел у рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур, які праходзіць у Гродне. Мы не адчуваем сябе тут чужымі. Гэта наш другі дом, і мы спадзяёмся, што Беларусь і надалей застанецца такой жа талерантнай і цудоўнай краінай, якой мы бачым яе цяпер.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Чвэрць стагоддзя 25

З гісторыі пытання

# ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК: У ПОШУКАХ БАЛАНСУ

**Гісторыя аховы прыроды ў Беларусі налічвае не адно стагоддзе. Пытанні захавання прыроды і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў прапісваліся яшчэ ў Статутах ВКЛ. Але канчатковая прыродаахоўная сістэма сфарміравалася ў ХХ стагоддзі. 29 жніўня 2020 года споўніцца 60 гадоў з прыняцця пастановы Савета Міністраў БССР № 480, паводле якой быў утвораны Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па ахове прыроды. У 1990 годзе ён быў перайменаваны ў Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па экалогіі, а ў 1994-м пераўтвораны ў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь. З гэтага часу ў краіне пачало фарміравацца і ўдасканальвацца прыродаахоўнае заканадаўства, якое адпавядае еўрапейскім нормам. Сёння вырашэнне многіх экалагічных праблем не сыходзіць з парадку дня. Забруджванне навакольнага асяроддзя, абыходжанне з адходамі, захаванне біялагічнай разнастайнасці, павышэнне экалагічнай культуры — як сумеснымі намаганнямі дзяржавы і грамадства ўдаецца захоўваць баланс інтарэсаў прыроды і чалавека, чытайце ў сённяшнім выпуску.**

## Хроніка аховы прыроды ў незалежнай Беларусі

**1997 год**

— Прыняты Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб нетрах.

**1998 год**

— Прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове атмасфернага паветра».

— Прыняты Водны кодэкс Рэспублікі Беларусь.

**2003—2004 гады**

— Пачалося фарміраванне сістэмы збору адходаў.

**2008 год**

— Уступіў у сілу Закон Рэспублікі Беларусь «Аб абыходжанні з адходамі», які пашырыў адказнасць вытворцаў.

**2010 год**

— Уступіў у сілу новы Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе».

— Зацверджана Палажэнне аб парадку правядзення грамадскай экалагічнай экспертызы.

**2011 год**

— Зацверджана Водная стратэгія Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 года.

— Прыняты Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб комплексных прыродаахоўных дазволах».

**2013 год**

— У Беларусі прынята Дзяржаўная праграма мер па змякчэнні наступстваў змены клімату на 2013—2020 гады.

**2015 год**

— Уступіў у сілу новы Водны кодэкс Рэспублікі Беларусь.

— Зацверджаны Нацыянальны план дзеянняў па прадухіленні дэградацыі зямель (у тым ліку глеб) на 2016—2020 гады.

**2016 год**

— Прыняты новы Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе, стратэгічнай экалагічнай ацэнцы і ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе».

**2017 год**

— Уведзены ў дзеянне экалагічныя нормы і правілы «Ахова навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанне. Патрабаванні экалагічнай бяспекі».

**2018 год**

— Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб экалагічнай сетцы» зацверджана схема нацыянальнай экалагічнай сеткі.

— Прыняты новы Закон Рэспублікі Беларусь «Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях».

**2019 год**

— Прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове і выкарыстанні тарфянікаў».

**2020 год**

— Зацверджаны План мерапрыемстваў па паэтапным зніжэнні выкарыстання палімернай упакоўкі з яе замяшчэннем на экалагічна бяспечную.

Экабяспека

# Празрыстыя, чыстыя, бяспечныя

**Ад стану атмасфернага паветра і паверхневых вод залежыць здароўе і чалавека, і навакольнага асяроддзя**

**За гэтымі паказчыкамі больш чым 25 гадоў сочаць у рамках Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя (НСМНА).**

## НА СВЕЖЫМ ПАВЕТРЫ

— Калі ў 1993 годзе маніторынг атмасфернага паветра праводзіўся ў 13 прамысловых цэнтрах Беларусі на 47 стацыянарных станцыях, то сёння ён ахоплівае 19 буйных гарадоў краіны, дзейнічае 67 пунктаў назіранняў, — расказвае **начальнік службы экалагічнай інфармацыі дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі цэнтр па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя» Мінпрыроды Алена БАГАДЗЯЖ.** — Шматгадовыя даныя паказваюць, што паступова канцэнтрацыі як асноўных, так і спецыфічных забруджвальных рэчываў у большасці гарадоў зніжаюцца. Якасць паветра ў цяперашні час стабільна добрая.

Так, па словах спецыяліста, у параўнанні з 2001 годам утрыманне аксіду вугляроду ў атмасферным паветры зменшылася ў 2,4—3,5 раза ў Мінску, Віцебску, Гродне, Магілёве. Аднак у Брэсце і Гомелі назіраецца пэўнае павелічэнне ўзроўню забруджвання паветра гэтым рэчывам.

У некаторых раёнах гарадоў у асобныя перыяды года бываюць перавышэнні па паказчыках пэўных забруджвальнікаў. Напрыклад, дэфіцыт ападкаў і вецер, якія ў апошнія гады часта назіраюцца вясной, правакуюць павелічэнне ўтрымання ў паветры цвёрдых часціц.

— Але паколькі метэаралагічныя ўмовы змяняюцца ў нас даволі часта, перыяды з павышанай канцэнтрацыяй шкодных рэчываў непрацяглыя, — адзначае Алена Пятроўна.

## ХТО ЗАБРУДЖВАЕ ВАДУ?

У 1993 годзе ў краіне налічвалася 128 пунктаў назірання паверхневых вод. Сёння за іх якасцю сочаць на 297 пунктах, размешчаных на 160 водных аб'ектах (86 вадацёках і 74 вадаёмах).

Тэндэнцыі, якія мы назіраем апошнім часам, сведчаць пра зніжэнне ўтрымання злучэнняў азоту і фосфару ў паверхневых водах у тры і больш разы ў параўнанні з пачаткам 1990-х гадоў, адзначае спецыяліст. У цэлым стан паверхневых водных аб'ектаў добры.

Найбольшую антрапагенную нагрузку зазнаюць яны ў басейнах Заходняга Буга, Дняпра і Прыпяці. Асноўныя крыніцы забруджвання паверхневых вод — сцёкавыя воды і дыфузны сцёк (тое, што трапляе з паверхневым змывам з тэрыторый гарадоў, палёў, жывёлагадоўчых ферм). Самыя ж чыстыя водныя аб'екты знаходзяцца ў басейнах Заходняй Дзвіны і Нёмана.

**Многія віды назіранняў у нашай краіне праводзяцца даволі даўно. Так, за станам атмасфернага паветра сочаць з 1965 года, за якасцю паверхневых вод — з 1940-х гадоў, радыяцыйны маніторынг праводзяць з 1980-х. У 1993 годзе ўсе віды экалагічнага маніторынгу, якія існавалі тады, былі ўключаны ў Нацыянальную сістэму маніторынгу навакольнага асяроддзя. Арганізацыю і каардынацыю яе функцыянавання ажыццяўляе Мінпрыроды.**

Акрамя антрапагенных фактараў, на стан паверхневых вод уплываюць і гідраметэаралагічныя ўмовы. Так, у межанны перыяд, пры нізкіх узроўнях вады ў рэках і азёрах узрастае біягеннае забруджванне водных аб'ектаў. Моцныя ліўні ў перыяд гарачыні спрыяюць павелічэнню тэмпературы вады, зніжэнню ў ёй канцэнтрацыі кіслароду і павелічэнню біягенных і арганічных рэчываў.

## СТАЎКА НА ЭКАТЭХНАЛОГІІ

— Планамернае ўкараненне на прадпрыемствах экалагічных тэхналогій, якія ўплываюць на якасць паверхневых вод і атмасфернага паветра, змена транспартнага парку, прыродаахоўная палітыка дзяржавы — усё гэта разам паўплывала на паляпшэнне стану навакольнага асяроддзя, — кажа Алена Багадзяж. — Што датычыцца паверхневых вод, то цяпер наша краіна паступова адыходзіць ад практыкі, калі ў якасці прыёмнікаў сцёкавых вод выкарыстоўваліся азёры. Разам з павышэннем эфектыўнасці ачысткі гэта паспрыяла і паляпшэнню стану водных аб'ектаў.

Сістэма маніторынгу таксама развівалася. За апошнія 25-30 гадоў сетка назіранняў значна пашырылася, асабліва ў пачатку 2000-х гадоў, калі дзяржаўныя праграмы па функцыянаванні і падтрымцы развіцця НСМНА былі накіраваны на пашырэнне сетак і развіццё тэхналогій.

Сёння ў гэтай сістэме выкарыстоўваюцца больш дасканалыя тэхналогіі, высокадакладныя прыборы і адпаведныя методыкі, аўтаматызавання сістэмы маніторынгу паветра. Усе лабараторыі, што праводзяць маніторынг паверхневых вод і атмасфернага паветра, акрэдытаваныя на адпаведнасць патрабаванням міжнароднага стандарту ISO 17025.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Біяразнастайнасць

# У ГАРМОНІІ З НАВАКОЛЛЕМ

**За 23 гады плошча асабліва ахоўных прыродных тэрыторый павялічылася на паўмільёна гектараў**

**Сёлета сваё 95-годдзе адзначыла першая асабліва ахоўная прыродная тэрыторыя Беларусі — Бярэзінскі біясферны запаведнік. А з пачатку гэтага года існуючая ў нас сістэма ААПТ уключае 1297 аб'ектаў, у тым ліку адзін запаведнік, чатыры нацыянальныя паркі, 99 заказнікаў рэспубліканскага і 282 — мясцовага значэння, 326 помнікаў прыроды рэспубліканскага і 585 — мясцовага значэння.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Менавіта такія ўнікальныя аб'екты, а іх агульная плошча складае больш за 1,8 мільёна гектараў, ці 9 % тэрыторыі краіны, — найважнейшы інструмент захавання біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці. Для параўнання: па стане на 1 студзеня 1997 года агульная плошча ААПТ у Беларусі складала 1,3 мільёна гектараў або 6,4 % ад усёй тэрыторыі. Між тым, як растлумачыла **кансультант упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Ала ГРЫНЧЫК,** размеркаванне ААПТ па абласцях нераўнамернае, што звязана са ступенню захаванасці натуральных экалагічных сістэм і каштоўных супольнасцяў: у Брэсцкай вобласці — 14,9 % ад яе тэрыторыі, у Віцебскай — 9,8 %, у Гомельскай — 7,4 %, у Гродзенскай — 10,1 %, у Магілёўскай — 4,6 %, у Мінскай — 7,5 %, у Мінску — 1,7 %.

У краіне створана нацыянальная сетка ААПТ. Яе аснову складаюць найбольш каштоўныя прыродныя комплексы і аб'екты. Па словах спецыяліста, за апошнія 20 гадоў удалося паменшыць негатыўнае ўздзеянне гаспадарчай дзейнасці на цэласнасць экасістэм, а таксама палепшыць экалагічную сітуацыю ў краіне.

Гэта магчыма дзякуючы, у першую чаргу, штодзённай плённай рабоце Мінпрыроды. Для кожнай ААПТ устанаўліваецца пэўны рэжым аховы і выкарыстання, які ўключае поўнае або частковае абмежаванне гаспадарчай дзейнасці, а ў шэрагу выпадкаў — правядзенне адпаведных навуковых мерапрыемстваў.

Вельмі важна, што беларускія ААПТ прызнаныя на міжнародным узроўні. Напрыклад, Белавежская пушча і Бярэзінскі біясферны запаведнік узнагароджаны Еўрапейскім дыпломам асабліва ахоўных прыродных тэрыторый Савета Еўропы. А частка нацыянальнага парку «Белавежская пушча» з'яўляецца аб'ектам Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Тры ААПТ — Бярэзінскі біясферны запаведнік, Белавежская пушча і Прыбужскае Палессе — уключаны ў Сусветную сетку біясферных рэзерватаў, створаную ў рамках праграмы ЮНЕСКА «Чалавек і біясфера».

У краіне праводзіцца маніторынг жывёльнага і расліннага свету, што дазваляе выяўляць віды, якія маюць патрэбу ў асаблівай ахове. Гэта дае падставу ўключыць іх у Чырвоную кнігу Беларусі. Цяпер у ёй 202 віды дзікіх жывёл (1,3 % ад іх агульнай колькасці ў краіне) і 303 віды дзікарослых раслін (2 % ад іх агульнай колькасці). «У параўнанні з трэцім выданнем Чырвонай кнігі, у чацвёртым агульная колькасць відаў дзікарослых раслін павялічылася на 29, а дзікіх жывёл — на 13. Сярод новых «герояў» — рыба гальян азёрны, птушка гуменная стрынатка, млекакормячыя вусатая начніца, шэры вушан, гарнастай, 31 від насякомых і 18 відаў раслін, — расказала **кансультант аддзела біялагічнай разнастайнасці Мінпрыроды Таццяна ЖАЛЯЗНОВА.** — Разам з тым у выніку паслядоўнай, планамернай работы па захаванні біялагічнай разнастайнасці з Чырвонай кнігі выключана 20 відаў дзікіх жывёл і 8 відаў дзікарослых раслін і грыбоў. Гэта значыць, што іх папуляцыі ўжо нічога не пагражае».

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**

Грамадскі кантроль

# Як любы ахвотны можа дапамагчы прыродзе?

**Людзей, якіх хвалюе экалогія, становіцца ўсё больш. Вырашыць экалагічныя праблемы можна рознымі шляхамі, сярод якіх не апошняе месца займае дзейнасць грамадскіх эколагаў. Кожны неабыякавы грамадзянін Беларусі, папоўніўшы іх шэрагі, можа стаць на абарону навакольнага асяроддзя і браць актыўны ўдзел у прыродаахоўнай справе.**



Грамадскія эколагі — гэта людзі, якія добраахвотна і бязвыплатна дапамагаюць Мінпрыроды і яго тэрытарыяльным органам у правядзенні прыродаахоўных мерапрыемстваў, прапагандзе беражлівага стаўлення да прыроды, павышэнні экалагічнай культуры грамадзян, а таксама ўдзельнічаюць у распаўсюджванні тэматычнай інфармацыі. Яны павінны ведаць заканадаўства Беларусі аб ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў, выконваць яго патрабаванні і паведамляць пра факты парушэнняў.

Насіць ганаровае званне «грамадскі эколаг» — вялікая адказнасць, менавіта таму кожны, хто жадае дапамагаць прыродзе, праходзіць пастаяннае навучанне.

— Пры Мінскім гарадскім камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя налічваецца 50 грамадскіх эколагаў, — расказала **загадчыца групы інфармацыйнага забеспячэння Мінгаркампрыроды Алеся ЯРМОЛЕНКА.** — Летась яны ўзялі ўдзел у 18 арганізаваных камітэтам конкурсах і мерапрыемствах. Найбуйнейшыя з іх — кампанія «Добраўпарадкуем малую радзіму!» у Музеі валуноў ва Уруччы, Еўрапейскі тыдзень мабільнасці і Дзень без аўтамабіля, конкурс знаўцаў птушак «Мудры філін», фатаграфій на экалагічную тэматыку «Зялёны Мінск» і іншыя. Усё гэта было б складана рэалізаваць без дапамогі грамадскіх эколагаў.

Штогод у Беларусі праводзіцца рэспубліканскі конкурс на найлепшага грамадскага эколага. Яго мэта — стымуляваць актывістаў, павышаць эфектыўнасць іх работы, а таксама даваць ім магчымасць абменьвацца вопытам. Летась трэцяе месца ў гэтым конкурсе заняў грамадскі эколаг Мінгаркампрыроды Руслан Шайкін, які больш за 20 гадоў свайго жыцця прысвяціў пытанням экалагічнай асветы і аховы прыроды.

— Званне грамадскага эколага дапамагае мне сістэматызаваць работу, стымулюе вывучаць прыродаахоўнае заканадаўства, сённяшнія патрэбы ў галіне захавання прыроды і карэктаваць свае дзеянні такім чынам, каб максімальна дапамагаць у вырашэнні актуальных экалагічных праблем, — кажа актывіст. — Больш за тое, паколькі я вельмі шмат займаюся пытаннямі асветніцкай дзейнасці, экалагічнага выхавання падрастаючага пакалення і дарослых, пазіцыя грамадскага эколага дае мне магчымасць рэалізавацца ў гэтым кірунку.

Менавіта стаўшы грамадскім эколагам, пры падтрымцы Мінгаркампрыроды я запусціў праекты «Зялёныя класы беларускай сталіцы», «Сава чакае дапамогі» і іншыя. Акрамя гэтага, я і мае калегі з Цэнтра экалагічнага выхавання і развіцця ўжо не першы год праводзім экскурсіі для ўсіх ахвотных па экасцежкы «Горад птушак». Дарэчы, яны таксама прыцягваюць увагу не вельмі культурных адпачывальнікаў на гэтай тэрыторыі і крыху дысцыплінуюць іх.

Трэба падкрэсліць, што пазіцыя грамадскага эколага дае мне пэўныя правы. Напрыклад, я магу нагадаць людзям пра неабходнасць выконваць прыродаахоўнае заканадаўства. Падчас тых жа экскурсій я падыходжу да людзей ды прашу іх прыбраць за сабой смецце, і, што дзіўна, да мяне заўсёды прыслухоўваюцца. Перыядычна мы праводзім своеасаблівыя рэйды — правяраем, у якім стане нашы стэнды ці няма несанкцыянаваных звалак. І па водгуках наведвальнікаў экасцежка «Горад птушак» стала нашмат чысцейшая. Прыходзіць менш некультурных кампаній, падцягнуліся людзі, якія хочуць вывучаць прыроду і могуць таксама зрабіць заўвагу, калі нехта парушае парадак. Прырода атрымала свайго кшталту грамадскі кантроль.

**Кацярына КІРЭЕВА.**
**Фота з архіва Цэнтра экалагічнага выхавання і развіцця.**

Экаадукацыя

# КРОК ЗА КРОКАМ

## Развіццё экалагічнай адукацыі — бесперапынны працэс

**Любоў да прыроды і экалагічную адказнасць трэба выхоўваць з дзяцінства. Потым зрабіць гэта будзе цяжэй. Менавіта таму ўдасканаленне адукацыі ў галіне навакольнага асяроддзя — найважнейшы прыярытэт нацыянальнага развіцця.**

Асновы «зялёнага» выхавання дзяцей у нашай краіне пачалі фарміравацца даволі даўно. Напрыклад, у Рэспубліканскай праграме па адукацыі ў галіне навакольнага асяроддзя на 1991—1995 гады, адобранай пастановай Савета Міністраў БССР ад 14 сакавіка 1991 года № 85, упершыню на дзяржаўным узроўні экалагічная адукацыя разглядалася як адзіны бесперапынны працэс ва ўсіх формах навучання, пачынаючы з дашкольнага выхавання і заканчваючы перападрыхтоўкай і павышэннем кваліфікацыі. Сур'ёзнае развіццё экалагічная асвета атрымала ў выніку рэалізацыі Канцэпцыі адукацыі ў галіне навакольнага асяроддзя і Рэспубліканскай праграмы ўдасканалення адукацыі ў галіне навакольнага асяроддзя (1999 г.). Экалагічная накіраванасць адукацыі дэкларавана ў якасці аднаго з прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі нашай краіны, што знайшло сваё адлюстраванне ў Кодэксе аб адукацыі. Пытанні «зялёнага» выхавання і інфарміравання насельніцтва ўвайшлі асобным раздзелам у Нацыянальную стратэгію сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 года.

**У 2019 годзе статус «Зялёная школа» атрымалі 57 устаноў адукацыі, яшчэ каля 300 рэалізуюць гэты адукацыйны праект.**

— Атрымліваецца, дзецям, з якімі мы пачалі працаваць па экалагічным кірунку, ужо каля 30 гадоў! І гэтыя маладыя людзі перадаюць атрыманыя веды сваім дзецям. Прыемна назіраць за мамамі і татамі, якія старанна і цярпліва вучаць сваіх дзяцей правільна сартаваць адходы каля кантэйнерных пляцовак, — падкрэсліла **намеснік начальніка ўпраўлення аналітычнай работы, навукі і інфармацыі Мінпрыроды Алена МЕЛЯШКОВА.**

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **14 августа 2020 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 28.07.2020 по 12.08.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

## МОГИЛЕВСКИЙ ФИЛИАЛ РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» сообщает о проведении 31.08.2020 открытого аукциона

**Лот № 1: изолированное помещение с инвентарным номером: 700/D-119033 – квартира № 31,** расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пр-т Мира, 25Г-31. Общая площадь 65,7 кв. м; назначение: квартира; число комнат: 2. Дополнительные сведения: общая площадь квартиры по СНБ – 74,0 кв. м, жилая площадь – 35,0 кв. м.

**Начальная цена продажи: 118 800,00 бел. руб.**
**Сумма задатка: 11 880,00 бел. руб.**

**Аукцион состоится 31 августа 2020 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесение задатка: по 28.08.2020 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** ОАО «Трест Белсантехмонтаж № 1», г. Минск, ул. Я. Коласа, 23, корп. 1, УНП 100039862

**Порядок проведения аукциона:** для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** Победитель аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Продавец и Победитель аукциона обязаны в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by

**Доп. информацию можно получить по тел.:**
**+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56 и на сайте ino.by**

# БЕРАГІНІ, ПРЫГАЖУНІ, МАЦІ, ТВОРЦЫ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Некаторыя намінацыі конкурсу застаюцца пастаяннымі, а назвы і сэнсавае напаўненне іншых мяняецца. Так, падчас узнагароджання «Жанчын года — 2017» у сталіцы віншавалі найлепшых у намінацыі «Ратуючы жыццё». Сёлета такога звання варты бадай што кожны медык краіны. Тым не менш у Саюзе адабралі сем найбольш адметных работнікаў сферы аховы здароўя з абласцей і сталіцы і перад цырымоніяй уручылі ім заслужаныя ўзнагароды.

*— Мы ўвесь час садзейнічаем росту ролі жанчыны ў грамадстве і спрыяем таму, каб больш жанчын было ў кіраванні, таму што гэта павышае стабільнасць у дзяржаве. Прапановы нашага Саюза заўжды ўлічваюцца пры распрацоўцы праграмных дакументаў і нарматыўна-прававой базы,* — упэўнена старшыня БСЖ. — *І мы падмацоўваем свае намаганні не толькі словамі, але і дакладнымі дзеяннямі: працуем на прадпрыемствах і ў арганізацыях краіны, удзяляем у грамадскім жыцці і ў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі, перш за ўсё сямейнай.*

«Паспяховымі кіраўнікамі» сёлета сталі ўрачы, юрысты, кіраўнікі арганізацый, старшыня райвыканкама. Яны робяць усё для лепшага і камфортнага жыцця ў краіне і маюць грамадзянскую пазіцыю, якая дае сілы развіваць Беларусь, заўважыла, віншуючы пераможцаў намінацыі, **Наталля КАЧАНАВА, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу.**

## СТЫМУЛ ДЛЯ НАРАДЖЭННЯ

Упершыню ў гісторыі конкурсу арганізатары вырашылі асобна аддзячыць сваім сяброўкам па Саюзе жанчын у намінацыі «Лідар Беларускага саюза жанчын». Узнагароджаных у гэтай катэгорыі атрымалася ажно дзевяць.

Уручаючы васільковую жарптушку руплівым прыгажуням, **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** падзякаваў жанчынам за працу, прыгажосць, любоў і пяшчоту. За тое, што часам яны церпяць моцную палову чалавецтва, хоць яшчэ невядома, хто моцны, а хто слабы, бо ў краіне гендарная роўнасць, прычым у большай ступені на карысць прыгожай часткі насельніцтва:



*— У якую сферу ні зірнеш — вы паўсюль на кіруючых пасадах, а мы, мужчыны, ужо ідзём туды, куды вы ведзяце. БСЖ — моцная, статусная і важная для краіны арганізацыя. Тут выпрацоўваюцца ідэі і падыходы, каб мы атрымлівалі адпаведныя сігналы і рэалізоўвалі сацыяльную палітыку, вырашалі дэмаграфічныя задачы, бо наша будучыня і моц у дзецях. А жанчына паспявае і нараджаць, і выхоўваць, і дом даглядаць, і працаваць.*

Ігар Петрышэнка згадаў таксама пра стымулы мець больш дзяцей. Гэта павелічэнне двойчы на год дапамог па доглядзе дзяцей да трох гадоў, выплаты за нараджэнне дзяцей, мацярынскі капітал.

*— Колькасць нараджэнняў у сем'ях трэціх і наступных дзяцей толькі за чатыры гады дзеяння праграмы сямейнага капіталу павялічылася на 40 %. Таму вырашана пралангаваць яе на наступныя пяць гадоў (2020–2024), тым больш што са з'яўленнем трэцяга дзіцяці цяпер не трэба чакаць атрымання капіталу да яго паўналецця, а можна выкарыстаць грошы на навучанне, будаўніцтва жылля ці лячэнне. Аднак важна, каб у сям'і была гендарная роўнасць у выхаванні малых і да гэтых пытанняў прыцягвалася больш бацькаў. Ужо другі год мы актыўна працуем над тым, каб цалкам ліквідаваць чаргу для шматдзетных сем'яў, каб людзі адчувалі клопат дзяржавы,* — дадаў ён.

## АНЁЛЫ МІРУ НА БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

Жанчына здольная зрабіць мужчыну або шчаслівым, або філосафам, таму няхай у Беларусі будзе як мага больш шчаслівых і менш філосафаў, пажартаваў **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК**, уручаючы ўзнагароды пераможніцам намінацыі «Мацярынская слава»:

*— Цяпер жанчынам не трэба спыняць каня і ўваходзіць у палаючую хату. Гэтым займаюцца ДАІ і ратавальнікі, але вы не засталіся ўбаку, асвоілі спрадвечна мужчынскія прафесіі і выконваеце актыўную ролю ў краіне.*

Ён заклікаў усіх падзякаваць сваім мамам і жонкам, падкрэсліўшы, што пакуль у краіне смяюцца дзеці — у яе ёсць будучыня.

Аб прыгажосці роснага золку, шуму дубровы, плёскату рэк, чысціні неба і паху хлеба — усё, чым так вабіць беларуская зямля, — згадалі ў намінацыі «Гаспадыня сяла». А **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Іван КРУПКО** падзякаваў пераможніцам, на плячах якіх трымаецца сельская сям'я і яе маральныя традыцыі, за ўменне падтрымліваць і ўпрыгожваць яе.

Віншавалі жанчын і артыстаў — дарослыя і маленькія. Спявачка **Юлія БЫКАВА**, напрыклад, сказала, як ганарыцца тым, што ў нас у краіне так шмат паспяховых жанчын.

*— Чым бы мы ні займаліся, найперш мы жанчыны, матулі, жонкі, дочкі. І мы павінны захоўваць уласны сямейны ачаг і агульны — нашу краіну, бо гэта закладзена ў нашай прыродзе. У сучасным свеце ад нас залежыць калі не ўсё, то многае,* — упэўнена артыстка.

Духоўнасць і культура фарміруюць нацыю і з пакалення ў пакаленне перадаюць маральны код беларускага народа. Пераможцаў адпаведнай намінацыі павіншаваў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ,** які ўпэўнены:

*— Вобраз беларускай культуры, вобраз нашай міралюбнай краіны — жаночы. І жанчына выбірае мужчыну — абаронцу зямлі беларускай.*

Адна з пераможніц гэтай творчай намінацыі **Валянціна ЧУДАЕВА** пайшла на фронт у 17 гадоў добраахвотніцай, была цяжка паранена, сустрэла Перамогу ў Польшчы. Гісторыя яе лёсу адлюстравана ў кнізе Святланы Алексіевіч «У вайны не жаночае аблічча». Летась Валянціна Паўлаўна стала адной з трох жанчын, адзначаных Саюзам у праекце БСЖ, прысвечаным 75-годдзю з дня Перамогі над нямецкімі захопнікамі.

*— Анёлы міру могуць быць толькі на беларускай зямлі, беражыце гэтую святую зямлю і верце ў Бога,* — сказала сёлета ветэран, прымаючы ўзнагароду.

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**





# ПАДТРЫМКА ДЗЕЛЯ РОСТУ: ІДЭІ АКТЫЎНЫХ ЖАНЧЫН

**Сусветная эканоміка сёння характарызуецца вельмі высокім узроўнем нявызначанасці.**
**Пра гэта заявілі эксперты падчас круглага стала Беларускага саюза жанчын. Яго тэма «Эканоміка. Развіццё без узрушэння» працягвае цыкл сустрэч «Жанчыны — за Беларусь!».**

Прычыны глабальнай нявызначанасці — пандэмія і чаканне другой хвалі каранавіруснай інфекцыі. Беларуская эканоміка, якая ў вялікай ступені залежыць ад замежных партнёраў, адчувае гэтыя тэндэнцыі на сабе.

«Сёння стаіць задача не толькі захаваць, але і аднавіць нашу эканоміку і выйсці на высокі ўзровень эканамічнага развіцця. Давядзецца вырашаць шмат задач сацыяльнай палітыкі. Нас, жанчын — маці, бабуль — хвалюе тое, як забяспечыць стабільны прырост прыбыткаў, занятасць, рабочыя месцы», — сказала **Людміла БАРАВІК, першы намеснік дырэктара па навуковай рабоце ДНУ «Навукова-даследчы эканамічны інстытут Міністэрства эканомікі», кандыдат эканамічных навук.**

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ, намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын Лілія АНАНІЧ** звярнула ўвагу на дасягненні айчыннай эканомікі: вялікую долю экспарту, рост экспарту медыцынскіх паслуг, вядучую ролю ў свеце беларускай вытворчасці кар'ернай, трактарнай тэхнікі, развіццё інфармацыйнага сектара.

«Для нас, жанчын, вельмі важны складнік — 25-е месца Беларусі са 179 дзяржаў у міжнародным рэйтынгу краін, спрыяльных для мацярынства і дзяцінства. Думаю, што гэтая пазіцыя — вынік развіцця нашай эканомікі. Дарэчы гэта, магчыма, і ініцыятывы Беларускага саюза жанчын, якія заўсёды чулі ва ўрадзе», — дадала парламентарый.

Пра магчымасці пашырэння эканамічнага патэнцыялу рэгіёнаў расказала **Наталля БЕРЧАНКА, намеснік дырэктара па навуковай рабоце ДНУ «Навукова-даследчы эканамічны інстытут Міністэрства эканомікі», кандыдат эканамічных навук.** Па яе словах, у кожным рэгіёне вызначаны цэнтры, якія ствараюць пункты росту і аб'ядноўваюць вакол сябе іншыя тэрыторыі.

«Гэта работа не аднаго года. Прыняць аднаўленне — гэта не значыць, што заўтра мы атрымаем вынік. Галоўнае, што мы іх (рэгіёны. — **«Зв.»**) бачым, і галоўнае, як кажуць, улівалі ваду ў помпу — тады будзе выхад. То-бок трэба ў гэтым кірунку рухацца, і важна, што дзяржава заняла пазіцыю лідара, садзейнічае ўсімі рэсурсамі, каб гэтыя тэрыторыі атрымалі развіццё», — кажа эксперт.

Ад банкаўскай супольнасці падчас круглага стала выступіла **Наталля ШАЎЦОВА, намеснік старшыні праўлення ААТ «Белаграпрамбанк»**. Яна запэўніла, што ў гэты няпросты час банкі імкнуцца аказваць крэдытную падтрымку прадпрыемствам.

«Сёння мы ідзём насустрач прадпрыемствам і прымаем нестандартныя рашэнні. Аказваем падтрымку і на выплату заробкаў, папаўненне абаротных сродкаў, на любыя мэты, звязаныя з аперацыйнай дзейнасцю прадпрыемстваў. Падтрымкі не бывае шмат — мабыць, дзесьці яе і недастаткова, але мы стараемся. Самае галоўнае, каб была зваротная сувязь: калі ёсць праблема, яе трэба пачуць і пайсці насустрач», — канстатуе банкір.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ** адзначыла, што нарматворцы таксама робяць свой унёсак у развіццё эканомікі: разглядаюць законапраекты, накіраваныя на падтрымку лічбавай эканомікі, сацыяльнай сферы, адміністравання ў галіне дзяржаўнага кіравання.

**Марыя ДАДАЛКА.**

На слыху

# ЧАС МАСАК

## Чалавецтва ўступае ў эпоху вірусных захворванняў



oxu.az

**Такі прагноз яшчэ ў пачатку 2000-х зрабіў заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь, інфекцыяніст Анатоль АСТАПАЎ. Мы задалі Анатолю Архіпавічу «абывацельскія» пытанні пра COVID-19 і пра тое, да чаго яшчэ нам рыхтавацца.**

### «На нашых людзей хіба маскі надзенеш?»

***— Сёння шмат кажуць пра другую хвалю COVID-19. Колькі вялікія шанцы, што восенню нас чакае другая хваля? А можа, яна ўжо пачалася?***

— Другой хвалі «ковіда» пакуль няма. Тое, што мы бачым цяпер па COVID-19, проста лагічнае развіццё падзей. Цяпер лета, нядрэннае раз'яднанне насельніцтва: многія людзі ў адпачынках, і імавернасць заразіцца ўсё ж меншая, чым, дапусцім, у сакавіку—красавіку. Акрамя таго, і ў крамах, і ў метро пакуль даволі шмат людзей у масках. Хоць, вядома, народ ужо расслабіўся і супакоіўся, маскі ў людных месцах носяць усё радзей. Паглядзіце фота з Кітая ў інтэрнэце — там да гэтага часу ўсе ў масках. Таму там атрымалася досыць хутка лакалізаваць інфекцыю. Пахаладае, стане менш ультрафіялету, пачнуць арганізоўвацца калектывы, людзі вернуцца з адпачынкаў, многія выйдуць з «аддалёнкі» — і, думаю, статыстыка па захворваннях на COVID-19 стане расці. Увосень можна чакаць другую хвалю пандэміі.

***— А маскі сапраўды дапамагаюць?***

— Дапамагаюць. Але маскі трэба правільна насіць. Гадоў 12 таму на Блізкім Усходзе была ўспышка каранавируснай інфекцыі з высокай смяротнасцю — гэта быў не «ковід», але яго «сваяк». І медыкі ўсяго свету з трывогай сачылі за развіццём падзей. Але пандэміі не здарылася дзякуючы своечасовым супрацьэпідэмічным мерапрыемствам. У прыватнасці, у эпідэмічным ачагу абсалютна ўсіх абавязалі насіць маскі. У іх усё ж такі больш дысцыплінаванае, мусульманскае грамадства. А на нашых людзей хіба маску надзенеш? Калі пажылыя людзі больш сур'ёзна ставяцца да гэтай неабходнасці, дык для моладзі маска хутчэй модны аксесуар — з коцікамі і смайлікамі. На самай справе лепш за ўсё абараняюць звычайныя медыцынскія маскі з нятканага матэрыялу, і мяняць іх трэба раз на 2-4 гадзіны. А шматразовыя маскі, каб яны абаранялі, трэба штодня мыць, і не толькі мыць, але і кіпяціць — ці хоць прасаваць гарачым прасам, — каб знішчыць тое, што трапіла на маску. У адваротным выпадку маска становіцца небяспечнай, бо вірус COVID-19 захоўваецца на тканіне некалькі дзён, і, надзеўшы тую маску яшчэ раз, мы проста ўцягваем яго ў арганізм. Насіць маску трэба так, каб нос і рот былі пад ёй. А тое, як носяць маску нашы людзі, — на падбародку, выставіўшы нос, таму што «горача і дыхаць цяжка», — ніякай абароны не дае. Многія выхапілі з кантэксту фразу «маскі не дапамагаюць» і радасна ёю бравіруюць. Так, калі проста на вас чхнуў заражаны чалавек, ніякая маска не ўратуе. Ні маска, ні пальчаткі цалкам вас не абароняць. Але факт застаецца фактам — імавернасць заражэння, калі вы носіце маску, усё ж меншая.

### «COVID-19 паражае амаль усе органы»

***— Чаму COVID-19 выклікаў такі неспакой медыкаў ва ўсім свеце?***

— У «ковіда» вельмі высокая кантагіёзнасць. Раней на першым месцы па гэтым параметры стаяў адзёр. Але COVID-19 — не менш, а можа, і больш кантагіёзны. Да таго ж вірус адру няўстойлівы ў знешнім асяроддзі, а вірус COVID-19 на некаторых паверхнях захоўваецца да 10 дзён. У тым ліку ён доўга жыве на поручнях у грамадскім транспарце, а на скуры рук (калі іх не мыць) здольны захоўвацца прынамсі тры дні. Усе вірусы размнажаюцца толькі ў жывых клетках. На штучных асяроддзях, у адрозненне ад бактэрый, вірусы не размнажаюцца. У клетку першапачаткова пранікае ДНК або РНК віруса. Трапляючы ўнутр клеткі, ён мяняе геном у ёй такім чынам, што клетка ператвараецца ў фабрыку па сінтэзе новых вірусных часціц. Калі іх утвараецца дастатковая колькасць, яны разбураюць клетку, выходзяць з яе і пранікаюць у наступныя.

Існуе «паволная» група вірусаў, якія дзесяцігоддзямі жывуць у нашых клетках, не выяўляючы сябе. Напрыклад, вірус простага герпесу. Дастатковa пераахаладжэння або іншых фактараў, якія зніжаюць супраціўляльнасць арганізма, і вірус актывізуецца. «Ковід» уваходзіць у так званую хуткую групу вірусаў. Ён хутка размнажаецца і высокакантагіёзны.

***— Ці можна выказаць здагадку, што з часам COVID-19 стане проста яшчэ адной хваробай, такой жа звыклай, як ВРЗ?***

— І цяпер многія перахварэлі на COVID-19 у сцёртай форме і нават не ведаюць пра гэта. У цяжкай форме хварэюць толькі некаторыя людзі. У групе рызыкі па смерці ад COVID-19 — людзі з хранічнымі лёгачнымі захворваннямі, з цукровым дыябетам, атлусценнем, гіпертаніяй, сардэчна-сасудзістай недастатковасцю, анкалогіяй; людзі, якія прымаюць цытастатыкі. Калі чалавек адносна здаровы, гэта не смяротны вірус. Лятальнасць па «ковідзе» ў свеце — ад 1 % да 5 %. Дзеці хварэюць адносна лёгка. Трэба берагчы людзей сталага ўзросту і тых, хто ўваходзіць у групу рызыкі. Іншая рэч, што гэты вірус небяспечны сваімі ўскладненнямі.

***— Якія ўскладненні дае COVID-19?***

— Вірус паражае амаль усе органы. Часцей за ўсё яны аднаўляюцца. Але бывае, што ў выніку гэтай хваробы, напрыклад, 50 % альвеалярнай тканкі лёгкіх замяняецца фібрознай. Чалавек будзе жыць, але 50 % лёгкіх у яго «мёртвыя». У выніку — дыхальная недастатковасць і гіпаксія. Праўда, гэта здараецца прыкладна ў 1 % выпадкаў. Не аднаўляюцца тыя клеткі розных органаў, у якіх размнажаўся вірус і разбурыў іх. Гэта могуць быць клеткі нырак, вірус можа выклікаць паражэнне страўнікава-кішачнага тракта або цэнтральнай нервовай сістэмы.

***— Ці выпрацоўваецца імунітэт да COVID-19?***

— Тут адзінай думкі пакуль няма. Ускосна пра наяўнасць імунітэту да COVID-19 сведчыць той факт, што добры эфект пры яго лячэнні дае ўвядзенне хворым сыраваткі крыві ад пацыентаў, якія перанеслі гэтую інфекцыю. Але даследчыкі схіляюцца да таго, што імунітэт да COVID-19 непрацяглы. Дакладна гэта яшчэ трэба будзе высветліць, адсачыўшы наяўнасць у арганізме чалавека, што хварэў на «ковід», антыцел — бялкоў, якія нейтралізуюць гэты вірус. Хацелася б, каб яны захоўваліся хоць год, як, напрыклад, пры грыпе. Але COVID-19 медыкі пачалі вывучаць толькі ў сакавіку. Пяць месяцаў — недастатковы тэрмін, каб зрабіць выснову пра трываласць імунітэту. Дый наогул для вывучэння новай хваробы. Напрыклад, сімптом страты нюху, з якога пачынаюцца клінічныя праявы COVID-19, — зусім новы для медыцыны, пры іншых вірусных захворваннях такога сімптому няма. Дарэчы, прыкладна ў 30 % выпадкаў «ковід» праходзіць бессімптомна: клінічных праяў хваробы няма, але чалавек з'яўляецца крыніцай інфекцыі.

***— Ці муціруе гэты вірус?***

— Складанае пытанне. Занадта мала часу мы за ім назіраем, каб рабіць высновы. Калі ўсё ж гэта штучна створаны вірус, то такія вірусы часцей стабільныя. Калі ж ён натуральны, хутчэй за ўсё, будзе муціраваць пры пасажы праз успрымальныя арганізмы. Асноўны паратунак ад каранавируснай інфекцыі — гэта імунізацыя. Цяпер медыкі ў розных краінах свету актыўна працуюць над вакцынай. Але калі COVID-19 муціруе, то вакцына супраць аднаго штама віруса не прынясе карысці супраць іншых штамаў. Класічны прыклад — вірус грыпу. У апошнюю эпідэмію грыпу да нас прыйшло тры штамы гэтага віруса: H2N2, H3N2, H1N1.

***— COVID-19 стаў нечаканасцю для медыкаў?***

— Не зусім так. Каранавірусы сустракаліся і раней, яны прыходзяць у сярэднім раз на 5-7 гадоў. Класічны прыклад каранавіруса — так званы птушыны грып. Але там заражэнне ідзе ад птушак, а хворы чалавек з'яўляецца эпідэмічным тупіком: ён не можа заразіць іншых людзей. Каранавірусы вірусолагі вывучалі і раней, але не настолькі актыўна, як цяпер.

### «Наша імунная сістэма — на мяжы сваіх магчымасцяў»

***— Чаму так часта ў наш час з'яўляюцца новыя небяспечныя для чалавека вірусы?***

— Мы жывём у неверагодна забруджаным асяроддзі, якое спрыяе мутацыям вірусаў. П'ём напоі з пластыкавых бутэлек, носім сінтэтыку, дыхаем забруджаным паветрам і купаемся ў забруджаных вадаёмах. Усе гэтыя рэчывы трапляюць у наш арганізм, і мы ўжо прасякнуты імі. Калі параўнаць хімічны састаў клетак арганізма чалавека XV і XXI стагоддзяў, ён будзе розны. Таму наша імунная сістэма працуе на мяжы сваіх магчымасцяў. Яна не паспявае за колькасцю тых антыгенаў, якія атакуюць наш арганізм. Паглядзіце, колькі цяпер з'явілася алергій! Раней такой колькасці не было. Вірусы муціравалі ва ўсе часы. Але чалавека гэта закранала ў меншай ступені, таму што ў яго была моцная імунная сістэма. Раней галоўным ворагам чалавецтва былі бактэрыяльныя інфекцыі: брушны тыф, сыпны тыф, бруцэлёз, шкарлятына, чума і г. д. Калі з'явіліся антыбіётыкі, бактэрыяльныя інфекцыі адступілі. Іх месца занялі вірусныя інфекцыі.

У сваім дакладзе аб перспектывах развіцця інфекцыйных захворванняў я казаў пра тое, што ў XXI стагоддзі варта чакаць вялікую хвалю вірусных хвароб. І не памыліўся — на жаль. І яшчэ варта разумець, што бактэрыяльныя інфекцыі не зніклі. Яны адступілі на нейкі перыяд. Проста пакуль нам удаецца спраўляцца з імі з дапамогай антыбіётыкаў. Але паколькі антыбіётыкі паўсюдна выкарыстоўваюцца нерацыянальна, чалавецтва сячэ сук, на якім сядзіць.

***— А што не так з выкарыстаннем антыбіётыкаў?***

— У нашы дні людзі п'юць антыбіётыкі з любой нагоды і нават «на ўсякі выпадак». Добра б яны хоць вытрымлівалі курс. Не! «Панос за два дні прайшоў — навошта труціцца?» Па-першае, кароткі курс (як правіла, чалавек прымае антыбіётык два-тры дні, а потым кідае), падругое, малыя дозы — такім чынам мы вучым бактэрыі выпрацоўваць рэчывы, якія разбураюць антыбіётык. Чалавецтву давядзецца выназходзіць усё больш і больш моцныя антыбіётыкі. Ці трэба казаць, што гэта тупіковы шлях, у канцы якога непазбежна чакае крах? Я запомніў такі эпізод з дзяцінства. Калі ў дзяцей у вёсцы гнаіліся вочы (гнойны кан'юнктывіт), жанчыны мылі іх твары вадой, якую пілі коні. Вы бачылі калі-небудзь карыта ў стайні? Яно ўнутры ўсё зялёнае — там размнажаецца грыбок пеніцылум. Гэта быў жывы пеніцылін. І ён дзейнічаў. Першы антыбіётык, які ў 1940-я гады стаў шырока выкарыстоўвацца ў медыцыне, быў пеніцылін. Пеніцылін зрабіў эпоху. Ну а потым яго бяздумнае выкарыстанне прывяло да таго, што ў патагенных мікраарганізмаў з'явілася ўстойлівасць. Цяпер мы бачым гэтую рэзістэнтнасць: бактэрыі выдзяляюць фермент пеніцылиназу, які разбурае пеніцылін. Чаму ў многіх краінах свету катэгарычна забаранілі свабодны продаж антыбіётыкаў? Дапусцім, з дапамогай антыбіётыка хворы зняў сімптаматыку. Узбуджальнік яшчэ не загінуў, але не выяўляе сябе. Пры гэтым у дадзенага мікраарганізма развіваецца ўстойлівасць да канкрэтнага антыбіётыку. І гэты ўстойлівы мікраарганізм чалавек перадае наступнаму «гаспадару». Прайшоўшы праз дзесятак арганізмаў, узбуджальнік становіцца вельмі моцным. Адсюль — неўспрымальнасць многіх мікраарганізмаў да метадаў лячэння хвароб, што раней былі эфектыўныя. Як вынік — унутрышпітальныя інфекцыі, што і ў нашай краіне, і па-за яе межамі з'яўляюцца сур'ёзнай праблемай.

***— Дык што чакае чалавецтва ў наступныя сто гадоў?***

— Ну, я не Месінг... Мяркую, будзе эпоха рэспіраторнай групы вірусаў, у тым ліку каранавірусаў (а эпоха кішэчнай групы вірусаў ужо надышла). Будуць прыходзіць пандэміі. Хутчэй за ўсё, вернуцца некаторыя пераможаныя і забытыя інфекцыйныя хваробы. Таму што ў нас у грамадстве вельмі дрэннае стаўленне да вакцынацыі. Я дзвюма рукамі за вакцынацыю. Калі б вы бачылі тое, што бачыў я за сваю шматгадовую практыку, вы б бегма пабеглі рабіць прышчэпкі сваім дзецям, нават нягледзячы на магчымыя пабочныя эфекты.

***— Як засцерагчы сябе ад вірусных хвароб?***

— Дапамогуць традыцыйныя метады, пра якія, напэўна, ужо апавешчаныя ўсе людзі ў любой краіне свету. Раз'яднанне. Маска. Пальчаткі. Абеззаражвальнікі для рук. Гігіена: мыць рукі, садавіну і агародніну. І вірусныя, і бактэрыяльныя захворванні — гэта хваробы грэбавання элементарнай гігіенай.

### «Беларускія медыкі справіліся»

***— Чаму радзіма новых інфекцыйных захворванняў апошніх гадоў — менавіта Кітай?***

— Цяжка сказаць. Напэўна, віной таму перанасяленне і спецыфіка харчавання. Справа ў тым, што кажаны (пра якіх можна згадаць у сувязі з COVID-19) валодаюць здольнасцю пераносіць розныя вірусныя інфекцыі ў латэнтнай форме. Напрыклад, заражэнне чалавека шаленствам паходзіць ад сабак, ваўкоў, лісіц, янотаў, вожыкаў і г. д., але ўсе іншыя жывёлы маюць яркія клінічныя праявы шаленства і ўрэшце гінуць ад гэтай хваробы. А кажаны не даюць яркай клінікі шаленства і не гінуць ад яго, але з'яўляюцца яго пераносчыкамі.

***— Нядаўна прайшло паведамленне пра ўспышку бубоннай чумы ў тым жа Кітаі і Манголіі. Здавалася б, гэтая бактэрыяльная хвароба была пераможана, чаму ж яна вярнулася?***

— Чуму перамаглі ў Еўропе. У многіх краінах свету яна працягвае існаваць і ўяўляе рэальную пагрозу. Памятаю даўнюю гісторыю, калі самалёт, што ляцеў з Індыі, з ачага чумы, пасадзілі ў Мінску. Людзі вярталіся з адпачынку: частка пасажыраў — беларусы, частка — літоўцы. Па літоўцаў тут жа прыехалі іх медыкі. А нашых грамадзян паклалі ў інфекцыйную бальніцу на каранцін. І вось пачалася ліхаманка ў адной з жанчын у ізалятары. Мяне выклікалі яе паглядзець. На шчасце, аказалася, што гэта банальная ангіна. І ніхто з нашых суграмадзян, якія так няўдала адпачылі ў ачагу ўспышкі чумы, не захварэў. Пасля доўгага каранціну яны проста паехалі дамоў. Чума цяпер досыць паспяхова лечыцца прэпаратамі стрэптаміцыну. За выключэннем лёгачнай формы чумы — яна дае лятальнасць 95 %.

***— Калі лічыць гэтую пандэмію «вучэннямі» напярэдадні эпохі вірусных інфекцый, што паказалі гэтыя «вучэнні»? Гатоўнасць або негатоўнасць нашай сістэмы аховы здароўя да магчымых пандэмій у будучыні?***

— Я сказаў бы, што паказалі гатоўнасць. Нашы медыкі дзейнічалі хутка і правільна. Мы своечасова ізалявалі хворых з падазрэннем на COVID-19. Ізалявалі першасныя кантакты. І напачатку ізалявалі таксама другасныя кантакты. Потым, калі ўзялі сітуацыю пад кантроль (што б там ні пісалі журналісты), сталі ізаляваць толькі хворых і першасныя кантакты. Цяпер ужо ўрачы глядзяць клініку: ці ёсць небяспека цяжкага развіцця хваробы. Беларуская інфекцыяністы і эпідэміёлагі вытрымалі гэтае выпрабаванне. Інфекцыяністы — гэта пажарныя медыцыны. І, думаю, у наступныя сто гадоў іх чакае шмат работы.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже права заключения договора аренды части здания магазина, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Калинковичский мясокомбинат» на праве собственности**

**Дата проведения аукциона: 31 августа 2020 г. в 10.00.**

**Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1**

| № лота | Наименование объекта аренды, его местонахождение | Арендуемая площадь ($м^2$) | Ставка арендной платы за 1 кв. м в месяц, рублей | Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), рублей | Задаток (в т. ч. НДС 20 %), рублей |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Часть здания магазина с инв. № 350/С-162516,** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Богдана Хмельницкого, 85А | **391,5** | **12,17** | **1 654,09** | **165,41** |

**Коэффициент** к базовой ставке арендной платы в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду составляет **3. Срок договора аренды: 5 лет**, начиная с момента заключения договора аренды. **Цель использования объекта аренды:** для осуществления розничной торговли продовольственными и непродовольственными товарами. **Шаг аукциона**: 5 %

**Продавец: ОАО «Калинковичский мясокомбинат»**, Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Северная, 8, тел.: 8 (02345) 2-60-47, 2-65-44. **Контактное лицо, ответственное за демонстрацию объекта,** – Муха Александр Михайлович, тел.: 8 (029) 382-69-73, 8 (0232) 23-87-60.

**Организатор аукциона:** Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23, тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95, сайт: www.gino.by, e-mail: inogomel@tut.by

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY27ALFA30122664720010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе 31.08.2020 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю аукциона), будет засчитан в счет окончательной стоимости права заключения договора аренды, сформированной в установленном порядке. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6,** начиная с момента публикации настоящего извещения, по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 27.08.2020 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются. Лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор выдает билет участника аукциона, в котором указан порядковый номер регистрации данного лица.

**При подаче заявления участник должен иметь:** копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе, на счет организатора аукциона, указанный выше; представитель физического лица и индивидуального предпринимателя – нотариально заверенную доверенность, представитель юридического лица – доверенность на подтверждение полномочий, оформленную в установленном порядке, руководитель юридического лица – оригинал соответствующего документа, подтверждающего его полномочия; индивидуальные предприниматели и юридические лица, резиденты РБ – копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения копии организатором аукциона; нерезидент РБ – документ, подтверждающий полномочия должностного лица, а также легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из государственного реестра страны происхождения, датированную не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе, или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

При подаче заявления на участие в аукционе заявители предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета в учреждении банка необходимо его открыть до подачи заявления на участие в аукционе.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, в т. ч. индивидуальные предприниматели, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления, своевременно подавшие необходимые документы на участие в аукционе, получившие билет участника аукциона и прошедшие заключительную регистрацию в соответствии с законодательством с 09.00 до 10.00 **31.08.2020 г.** Договор аренды может быть заключен только с участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю). Заключение договора аренды объекта, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов. Продавец вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю аукциона, признается единственный зарегистрированный участник аукциона, согласившийся купить предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не имеет права отчуждать право аренды объекта третьим лицам, а также сдавать объект в субаренду.

**Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю) обязан** в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи права заключения договора аренды объекта; в течение 15 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Арендодателем договор аренды объекта; в течение 10 календарных дней с момента заключения договора аренды объекта выплатить Арендодателю стоимость права заключения договора аренды (за вычетом внесенной суммы задатка).

## ГОМЕЛЬСКИЙ ФИЛИАЛ РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает о проведении 28 августа 2020 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже автотранспортных средств, принадлежащих Открытому акционерному обществу «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир» на праве собственности**

| № лота | Наименование, краткая характеристика объекта | Начальная цена, рублей (в т. ч. НДС по ставке 20 %) | Задаток, рублей (в т. ч. НДС по ставке 20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Грузовой автомобиль ГАЗ 3309, регистрационный знак АА 5519-3, год выпуска 2006.** Цвет: белый. Тип: грузовой фургон. Номер кузова (рамы): 33070060102131 33090060901865. Объем двигателя: 4750 $см^3$. Вид топлива: дизель. Состояние: автомобиль эксплуатируется | **6 600,00** | **330,00** |
| 2 | **Грузовой автомобиль ГАЗ 3309, регистрационный знак АЕ 8426-3, год выпуска 2005.** Цвет: белый. Тип: грузовой специальный фургон изотермический. Номер кузова (рамы): Y3H47380050036277 X9633090050889296. Объем двигателя: 4750 $см^3$. Вид топлива: дизель. Состояние: автомобиль эксплуатируется | **6 336,00** | **316,80** |
| 3 | **Грузовой автомобиль МАЗ 5340, регистрационный знак АК 9293-3, год выпуска 2011.** Цвет: белый. Тип: грузовой бортовой тентовый. Номер кузова (рамы): Y3M5340A5B0000240. Объем двигателя: 14750 $см^3$. Вид топлива: дизель. Состояние: автомобиль эксплуатируется | **20 592,00** | **1 029,60** |

**Местонахождение имущества:** г. Гомель, ул. Войсковая, 16. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 27.07.2020 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **28.07.2020 г.**

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов. Шаг аукциона – 5 %.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

**При подаче заявления участник должен иметь:** 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; индивидуальный предприниматель – паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором аукциона; представитель индивидуального предпринимателя – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидент РБ) – паспорт (руководитель – копию документа подтверждающего назначение на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидент РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык.

В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY27ALFA30122664720010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г.Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе по лоту №___ согласно извещению в газете «Звязда» от 28.07.2020 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (единственным участником, выразившим согласие купить Объект), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задатки, уплаченные участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить Объект), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить объект) обязан:** в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере четыре процента от цены продажи Объекта, сформированной в установленном порядке; в течение 10 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в течение 3 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке.

**Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95.**
**• сайт: gino.by • e-mail: auction-gino@gino.by**
**Продавец: ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир», г. Гомель, ул. Севастопольская, 106.**
**Тел.: 8 (033) 372-87-77, 8 (0232) 25-49-97.**

## БЛОНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ПУХОВИЧСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

**проводит открытый аукцион по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов гражданам Республики Беларусь, расположенного в Блонском сельсовете**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации, руб. | Начальная цена, руб. | Задаток, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Заречье, ул. Вишневая, уч-17, № 624480801601000300** | 0,1087 га | Сети электроснабжения, водоснабжение, газовый кооператив | 1384,96 плюс расходы за размещение объявления | 5524,13 | 552,41 |

Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении.

Задаток перечисляется на р/с BY13AKBB36006250200050000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, пр-т Дзержинского, 18, БИК банка AKBBBY2X, код платежа – 04901, УНН 600177637, ОКПО 04430996, Блонский сельисполком.

**Аукцион состоится 04 сентября 2020 года в 15.00 по адресу: аг. Блонь, ул. Садовая, 4А (здание исполкома) Пуховичского района Минской области. Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 29 августа 2020 года до 13.00 по вышеуказанному адресу.**

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

